Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 МАЯ 2016 г. СУБОТА № 90 (28200) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Зарабляць на гадаванні ўнукаў**

СТАР. 5



**Прэм'ера ў РТБД**

СТАР. 9



**Рак — не прысуд**

СТАР. 12

*ЛІЧБА ДНЯ*

**100,7%**

*склаў індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў красавіку 2016 года ў параўнанні з сакавіком, а са снежнем 2015-га — 106,4%, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Харчовыя тавары ў красавіку падаражэлі на 0,8% у параўнанні з сакавіком і на 10,7% у параўнанні з красавіком 2015 года. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 0,8% і 10,8% адпаведна. Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў красавіку склаў 100,5% у параўнанні з сакавіком і 120,6% — з красавіком 2015 года.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +17° |
| Віцебск | +19° |
| Гомель | +18° |
| Гродна | +18° |
| Магілёў | +19° |
| Мінск | +17° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19266,00 | ▲ |
| Еўра | 21845,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 296,61 | ▲ |
| Укр. грыўня | 755,75 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ТЫ НАША СОНЕЙКА!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# КАЛІ СЛОВА АБ'ЯДНОЎВАЕ

**Стварэнне добрасуседскага інфармацыйнага поля стала асноўным пытаннем XI Беларускага міжнароднага медыяфоруму**

**Сёлета ў мерапрыемствах, што прайшлі на розных пляцоўках форуму ў фармаце спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі», летняй школы журналістыкі, пленарнага пасяджэння, панэльнай дыскусіі прынялі ўдзел прафесіяналы з больш як 20 краін свету. Гэта прадстаўнікі экспертнай медыйнай супольнасці, кіраўнікі буйных газет і інфармацыйных агенцтваў. Арганізатарамі форуму выступілі Міністэрства інфармацыі Беларусі, Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы.**

СТАР. 3



Фота Надзеі БУЖАН.

# Спачатку — штамп...

**Беларусы бяруць шлюб часцей, чым еўрапейцы**

**Як змяніліся беларускія сем'і за апошнія дзесяць гадоў? На якую падтрымку могуць разлічваць бацькі, што выхоўваюць дзяцей? Што новага чакаецца ў сямейнай сферы? Пра гэта напярэдадні Дня сям'і расказала намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендэрнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.**

## Жаніхі і нявесты пастарэлі

Беларусь не адстае ад еўрапейскіх тэндэнцый. Нашы хлопцы і дзяўчаты перш імкнуцца атрымаць адукацыю і знайсці месца працы, а ўжо потым гуляць вяселле. Летась сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб сярод мужчын склаў 27,5 года, сярод жанчын — 25,5. Для параўнання: дзесяць гадоў таму жаніліся і выходзілі замуж на два гады раней, у 25,7 і 23,5 адпаведна. Дзяцей беларусы таксама адкладаюць на больш познія тэрміны. Калі ў 2005 годзе першынца жанчыны нараджалі ў 23,9 года, то цяпер — ужо ў 26. На другое дзіця маці звычайна рашаюцца ва ўзросце 30,6 года.

Разам з тым каэфіцыент шлюбнасці ў нашай краіне адзін з самых высокіх у Еўропе — 8,6 на тысячу чалавек.

— Гэты паказчык сведчыць пра тое, што каштоўнасць і значнасць афіцыйнага саюзу для большасці насельніцтва захоўваецца, — каментуе Марына Арцёменка.

Яшчэ адна пазітыўная тэндэнцыя — скарачэнне ўдзельнай вагі дзяцей, народжаных не ў шлюбе. Калі ў 2009 годзе доля такіх малых дасягала амаль 20 працэнтаў, то летась яна знізілася да 13,8 працэнта. Радзей сустракаецца адзінокае мацярынства. Суды ў перыяд з 2010 па 2014 год разгледзелі каля 8,5 тысячы іскаў аб устанаўленні бацькоўства, 80 працэнтаў з якіх былі задаволены.

СТАР. 5

■ Афіцыйна

# Верны саратнік дзяржавы

**Беларускі фонд міру і надалей будзе садзейнічаць рэалізацыі міратворчых ініцыятыў. Пра гэта гаворыцца ў прывітанні, якое Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў удзельнікам урачыстага сходу, прысвечанага 55-й гадавіне ўтварэння Беларускага фонду міру.**


Фота БЕЛТА.

«Сёння Беларускі фонд міру беражліва захоўвае і ўмацоўвае традыцыі мінулых гадоў, аб'ядноўваючы ў сваіх шэрагах больш за 12 тысяч чалавек, — адзначыў беларускі лідар. — Арганізацыя здольна эфектыўна змагацца за інтарэсы свету ў няпростай сучаснай рэальнасці, быць верным саратнікам дзяржавы ў вырашэнні сацыяльных і эканамічных праблем».

**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта**, у размове з журналістамі выказаў думку, што Беларускі фонд міру кансалідуе грамадскасць для добрых спраў. Ён адзначыў, што праца арганізацыі існуе не на словах, а адлюстроўваецца ў канкрэтных праектах і праграмах, атрымлівае водгукі ад грамадскасці.

«Мы з'яўляемся сведкамі самых розных маштабных праектаў, прымеркаваных да Перамогі, да дзяржаўных свят і мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне і прымнажэнне такіх паняццяў, як мір, сацыяльная справядлівасць, — сказаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Гэта тыя непарушныя каштоўнасці, якія Рэспубліка Беларусь па крупінцы захавала і імкнецца прымнажаць». Ён заўважыў, што, на вялікі жаль, сёння часам адбываецца пераацэнка такіх, здавалася б, бясспрэчных ісцін і каштоўнасцяў, як мір. У нашай дзяржаве гэтая каштоўнасць па-ранейшаму застаецца непарушнай. Па яго словах, дзяржава будзе развіваць і падтрымліваць дзейнасць Фонду міру.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Вопыт

# ЗДАРОЎЕ ДАРАЖЭЙ ЗА ГРОШЫ

**У Мінскай вобласці практычна завершана праграма будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчых комплексаў**

**Толькі за апошнюю пяцігодку на Міншчыне ўзведзена 10 фізкультурна-аздараўленчых комплексаў. Такія аб'екты ёсць практычна ва ўсіх раённых гарадах. Сёлета плануецца завяршыць будаўніцтва ФАКа ў Валожыне. Пакуль няма аналагічных спартыўных збудаванняў у Капылі, Старых Дарогах і Уздзе. Ды гэта справа часу — у перспектыве яны там абавязкова з'явяцца.**

Летась фізкультурна-аздараўленчы комплекс адкрыўся ў Чэрвені. На яго ўзвядзенне затрачана 8,8 млрд рублёў. Комплекс разлічаны на наведвальнікаў рознага ўзросту і схільнасцяў. Тут ёсць басейн для аздараўленчага плавання, дзіцячы басейн, спартыўная зала з трыбунай на 164 месцы, трэнажорная, барцоўская і фітнес-зала, лазневы комплекс. Штодзень пры поўнай загрузцы комплекс можа прыняць каля тысячы чалавек. Аб'ект перададзены на баланс Чэрвеньскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву, якая адкрыла тут аддзяленне плавання для дзяцей, арганізавала навучанне плаванню школьнікаў раёна, стварыла спецыяльныя класы па вольнай барацьбе, лёгкай атлетыцы, футболе. Частка паслуг для жыхароў аказваецца на платнай аснове. Але для групавых і сямейных заняткаў, для дзяцей, пенсіянераў, інвалідаў прадугледжаны зніжкі.

— У аснове будаўніцтва такіх аб'ектаў — клопат у першую чаргу аб будучыні юных грамадзян, каб яны раслі здаровымі, каб у кагорце спартыўных герояў, якія праслаўлялі Беларусь і ў прыватнасці чэрвеньскую зямлю, з'явіліся новыя імёны, — адзначыў **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА**. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна лічыць, што на гэтым аб'екце павінны знайсці сабе занятак любы прыхільнік здаровага ладу жыцця, як з райцэнтра, так і горада: «Гэты комплекс мы пабудавалі разам, усе, хто жыве ў раёне і плаціць падаткі, а таксама краіна, якая выбрала сацыяльна арыентаваную палітыку на мір і згоду ў грамадстве».

Сапраўды, адкрыццё комплексу — добры шанц праявіць сябе ў спорце падлеткам, моладзі. А раўняцца ім ёсць на каго. Чэрвеньская зямля дала краіне нямала слаўтых спартсменаў. Валерый Шарый — першы беларускі алімпійскі чэмпіён па цяжкай атлетыцы. Людміла Ваўчок — чэмпіёнка зімніх Паралімпійскіх гульняў у Турыне 2006 года, у Ванкуверы 2010 года.

**У тэму**

**Вячаслаў ШЫПАРАЎ, намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Мінаблвыканкама:**

— За апошнюю пяцігодку сетка спартыўных аб'ектаў на Міншчыне значна пашырылася. Толькі ў мінулым годзе ўведзены ў дзеянне крытая лядовая пляцоўка ў г. Жодзіна і футбольнае поле са штучным пакрыццём у Слуцку, міні-футбольная пляцоўка са штучнай травой у аграгарадку Ракаў, устаноўлены вулічныя трэнажоры ў Бараўлянах і аграгарадку Ракаў, фізкультурна-аздараўленчыя комплексы з плавальнымі басейнамі ў Стоўбцах і Чэрвені. Усяго ж у вобласці налічваецца 2850 фізкультурна-спартыўных збудаванняў усіх формаў уласнасці, а таксама 39 цэнтраў, клубаў, дзе працуюць 466 спецыялістаў фізічнай культуры і спорту. На іх базе дзейнічае больш як 3 тыс. груп і секцый па разнастайных відах спорту, якія наведваюць 65 тыс. чалавек, у тым ліку 70% з іх — дзеці. Толькі за мінулы год праведзена больш як 400 спартыўна-масавых мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел 292 тыс. жыхароў вобласці.

Візіткай Міншчыны з'яўляюцца штогадовыя Нацыянальныя фестывалі бегу «Капыльскія пагоркі» і «Языльская дзясятка» ў Старадарожскім раёне, фестываль вулічнай культуры і турнір па стрытболе Strekoza на Дзяржыншчыне. Сталі традыцыйнымі спаборніцтвы для дзяцей і падлеткаў «Залатая шайба», «Скураны мяч», «Снежны снайпер», спартакіяды па месцы жыхарства па 7 відах спорту, зімняму і летняму шматбор'ях «Абаронца Айчыны» сярод дапрызыўнай і прызыўнай моладзі і іншыя.

Для дзяцей і падлеткаў праведзена 30 велафестываляў, прысвечаных памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны і воінаў-інтэрнацыяналістаў. Падтрыманы праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Стварэнне пілотнага ўчастка «Налібоцкая пушча — Мінск» веламаршруту Euro Velo-2», які пройдзе па тэрыторыях Валожынскага, Мінскага і Стаўбцоўскага раёнаў.

На спартыўных аб'ектах асаблівая ўвага — удасканаленню формаў і метадаў фізкультурна-аздараўленчай работы з насельніцтвам, праводзяцца акцыі, дні адчыненых дзвярэй, майстар-класы. Усюды дзейнічае сістэма зніжак ад 10 да 70% або праводзяцца бясплатныя заняткі для дзяцей, шматдзетных сем'яў, пенсіянераў, інвалідаў. Прадугледжаны таксама зніжкі ў святочныя дні.

Новаму фізкультурна-аздараўленчаму комплексу, які ўрачыста расчыніў дзверы летась напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка, не могуць нарадавацца і жыхары Стаўбцоўшчыны. Спачатку будынак, дзе месціцца аб'ект, прызначаўся для кулінарнага вучылішча. Але работы на ім былі прыпынены. У 2005 годзе прынята рашэнне аб рэканструкцыі даўгабуда ў два этапы. Першая чарга ўведзена ў дзеянне 30 снежня 2014 года і ўключае чатырохпавярховы будынак з трэнажорнымі заламі, памяшканнямі для настольнага тэніса, більярда, часовага пражывання спартсменаў на 27 месцаў з усімі неабходнымі бытавымі ўмовамі, офісам. У будынку другой чаргі — універсальная спартыўная зала для гульнявых відаў спорту з трыбунамі на 390 месцаў, плавальны басейн, трэнажорная зала, залы для барацьбы і аэробікі, лазня, буфет. Тут створана безбар'ернае асяроддзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У прыватнасці, для інвалідаў-калясачнікаў забяспечана неабходная шырыня дзвярных праёмаў, абсталяваны спецыяльныя санвузлы, месцы ў глядзельнай зале. А каб без праблем дабрацца да вады ў басейне, зроблены спецыяльны спуск.

Летась завершаны капітальны рамонт басейна Клецкага фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Тут заменена каналізацыйная сістэма і сістэма водазабеспячэння, абноўлены санвузлы і душавыя, чаша басейна аздоблена сучаснай пліткай. На ўсе работы затрачана больш як 1,3 млрд рублёў. Большасць сродкаў выдаткавана з абласнога бюджэту. Басейн карыстаецца попытам у жыхароў раёна і горада, сюды выстройваюцца чэргі. Работы па рэканструкцыі фізкультурна-аздараўленчага цэнтра працягваюцца.

Дадам, што стварэнне новых аб'ектаў — гэта яшчэ і новыя рабочыя месцы для жыхароў Міншчыны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# НОВЫЯ ПАРТНЁРЫ

**У пачатку наступнага тыдня нашу краіну наведае дэлегацыя з Саудаўскай Аравіі**

**Госці з Усходу плануюць прыняць удзел у другім пасяджэнні Беларуска-Саудаўскага сумеснага міжурадавага камітэта. Пра гэта на чарговым брыфінгу паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

Дэлегацыю Каралеўства Саудаўская Аравія ўзначаліць намеснік міністра замежных спраў Юсуф бен Тарад аль-Саадун. Як паведаміў прадстаўнік МЗС, гэта першы візіт да нас саудаўскай дэлегацыі, у якую ўваходзяць прадстаўнікі розных дзяржаўных устаноў і дзелавых колаў каралеўства.

«У склад афіцыйнай дэлегацыі ўваходзяць 18 прадстаўнікоў міністэрстваў замежных спраў, гандлю і інвестыцый, сельскай гаспадаркі, адукацыі, транспарту, па справах водных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Саудаўскай Аравіі, а таксама агенцтва па справах харчавання і медыкаментаў, Навукова-тэхналагічнага гарадка імя караля Абдэль Азіза, — праінфармаваў Дзмітрый Мірончык. — Акрамя таго, у рамках візіту ў нашу дзяржаву прыбывае буйная дзелавая дэлегацыя Каралеўства Саудаўская Аравія, у якую ўвайшлі больш за 30 прадстаўнікоў саудаўскіх кампаній. Падчас візіту плануецца абмеркаванне шырокага спектра пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, уключаючы ўзаемадзеянне ў галіне эканомікі, гандлю, інвестыцый, прамысловасці, сельскай гаспадаркі, фармацэўтыкі, транспарту, водных рэсурсаў, вышэйшай адукацыі, навукі, тэхналогій і культуры».

Падчас візіту плануецца падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Каралеўства Саудаўская Аравія, а таксама выніковага пратакола пасяджэння сумеснага міжурадавага камітэта.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**Прамая лінія**

## Усё, што вы хацелі даведацца пра пенсіі

Ці павялічыцца перадпенсійны тэрмін, у якім працадаўца не мае права не падоўжыць вам кантракт? Як будуць плаціць пенсію тым, хто працаваў за мяжой? Калі будуць выходзіць на пенсію вайскоўцы і міліцыя? Якая выслуга гадоў зараз будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні вам адкажуць **спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння ДРОНАВА Алена Уладзіміраўна і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства САМАДУМСКАЯ Аляксандра Вітальеўна** — падчас «прамой лініі», якая адбудзецца ў «Звяздзе» **19 мая з 11.00 да 12.00.**

**Тэлефануйце: 8 (017) 287-18-71**

***Папярэднія пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») можна дасылаць на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.***

## КЛІМАТЫЧНАЕ «СЕРАБРО»

**Сярэбраны медаль на VI Міжнароднай алімпіядзе праектаў па навакольным асяроддзі (GCIEPO) «Залаты клімат» у Кеніі атрымала выхаванка Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Ульяна Быкава.**

Усяго на алімпіядзе было прадстаўлена 120 праектаў з больш чым 30 краін. Беларусь на алімпіядзе ўпершыню была прадстаўлена ў катэгорыі «Навакольнае асяроддзе» праектам Ульяны Быкавай «Ацэнка магчымасці глыбіннага культывавання і прадуцыйнасці міцэлію біямасы некаторых лекавых макраміцэтаў па вытворчасці харчовых дабавак».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ПАПА ФРАНЦІШАК ПРЫЗНАЧЫЎ НОВАГА НУНЦЫЯ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Як паведамляе сайт catholic.by, новым паслом Ватыкана ў нашай краіне прызначаны Габар Пінтэр.**

Новы нунцый Беларусі паходзіць з Венгрыі. Прасвітарскае пасвячэнне прыняў у 1988 годзе. На дыпламатычнай службе ў Ватыкане з 1 ліпеня 1996 года. Працаваў у Гаіці, Балівіі, Скандынавіі, Францыі, Філіпінах. Да нядаўняга часу Габар Пінтэр быў дарадцам апостальскай нунцыятуры ў Аўстрыі. Ён валодае венгерскай, нямецкай, італьянскай, англійскай, французскай, іспанскай, крэольскай, шведскай і рускай мовамі.

**Якаў ЖУРБІН.**


ОБЪЯВЛЕНИЕ

**02 июня 2016 г.**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Камволь»**

**Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4-й этаж главного корпуса.**

**Повестка дня**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».
2. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Маяковского, 176, ком. 204, тел.: 223 16 22.**

Начало работы собрания – **10.00**.

Регистрация участников собрания **с 08.45 до 09.45.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 30.05.2016 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

# КАЛІ СЛОВА АБ'ЯДНОЎВАЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сёння, калі свет становіцца ўсё больш і больш раз'яднаным, калі адзінкавыя канфлікты разбураюць доўгачасовыя добразычлівыя адносіны паміж дзяржавамі, вельмі важнай бачыцца роля СМІ ў кансалідацыі краін і народаў, вырашэнні рознагалоссяў шляхам праўдзівага адлюстравання фактаў, стварэння пазітыўнага інфармацыйнага поля. Таму невыпадкова сёлетні медыяфорум, які прайшоў пад знакам 25-й гадавіны СНД і 20-годдзя будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, быў прысвечаны пытанням пабудовы добрасуседскай інфармацыйнай прасторы. Звяртаючыся да ўдзельнікаў медыяфоруму, **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ** падкрэсліла:

— Чарговы раз Беларускі міжнародны медыяфорум пацвердзіў свой статус медыйнай пляцоўкі, дзе абмяркоўваюцца актуальныя працэсы сучаснасці і роля СМІ ў іх. Сёлета мы асабліва актыўна абмяркоўваем тэмы інтэграцыі, пазітыўнага супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Роля СМІ ў гэтых працэсах у нашы дні надзвычай вялікая, бо новыя інфармацыйныя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца медыясупольнасцю, з'яўляюцца як вельмі карыснымі, так і нясуць пагрозу. Гэта адбываецца, калі медыйная сфера трапляе пад уладу нядобрасумленных людзей. Тады канфлікты, войны інтэрпрэтуюцца ў СМІ без беражлівага стаўлення да галоўнага — чалавечага жыцця, мірнага суседства краін і народаў.

Пра неабходнасць рэалізоўваць сумесныя праекты ў галіне інфармацыі, праграмы, што адлюстроўваюць кансалідуючыя пазіцыі краін, у сваім выступленні разважаў і **намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ**. Ён зазначыў:

— Часта ў працэсе, які сёння характарызуюць як эканамічны крызіс, мы пачынаем пераасэнсоўваць падыходы да ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі, у тым ліку інфармацыйныя. Адстойваючы пазіцыі, інтарэсы сваіх дзяржаў, нацыянальных інфармацыйных пляцовак, мы не павінны забываць пра імкненне да канструктыўнага дыялогу. Ён павінен весці да сумеснага супрацьстаяння выклікам часу.

І сапраўды, актуальнай задачай сучасных медыя бачыцца стварэнне кансалідаванага інфармацыйнага поля, падача праўдзівых, узважаных фактаў, распрацоўка сумесных праграм і рэалізацыя міжнародных праектаў у галіне медыя.

## Дзяліцца лепшым

***Чаму складана ўявіць жыццё краіны без інтэграцыйных працэсаў?***

**У рамках медыяфоруму прайшла панэльная дыскусія на тэму «Чвэрць стагоддзя суверэннага развіцця і інтэграцыі». Эксперты з розных краін выказалі свае думкі наконт таго, якую ролю іграюць на постсавецкай прасторы інтэграцыйныя аб'яднанні, а таксама падзяліліся меркаваннямі пра якасць і стан сучаснай журналістыкі.**

### Не канкурэнцыя, а супрацоўніцтва

**Уладзімір ГАРКУН, першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў:**

— Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Саюзная дзяржава, Еўразійскі эканамічны саюз, Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы — усе гэтыя аб'яднанні вельмі патрэбны. Складана ўявіць, што было б, калі б сёння не існавала гэтых інтэграцыйных структур. Мы не канкуруем, а даём магчымасць адзін аднаму выкарыстоўваць свае напрацоўкі.

**Даўрэн ДЗІЯРАЎ, генеральны дырэктар Міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Казінфарм»:**

— Казахстан заўсёды быў ініцыятарам і праваднікам інтэграцыйных працэсаў. Вы ўсе ведаеце, што ёсць Алма-ацінская дэкларацыя па СНД, у Астане падпісвалася пагадненне па стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. Што да асвятлення інтэграцыйнага працэсу, то хацеў бы падкрэсліць ролю нашага Інфармацыйнага савета СНД, куды ўваходзяць інфармацыйныя агенцтвы краін Садружнасці. Сёння на сайтах нашых інфармацыйных агенцтваў — «Казінфарма», БЕЛТА, «Трэнд» і іншых — можна знайсці інфармацыю, прысвечаную жыццю краін-партнёраў. Так, на сайце «Казінфарма» можна прачытаць апошнія навіны з Беларусі, Арменіі, Азербайджана. Магу сказаць, што ў нашых чытачоў ёсць цікавасць да таго, што адбываецца ў іншых дзяржавах Садружнасці.

**Кірыл КОКТЫШ, дацэнт кафедры палітычнай тэорыі МДІМА:**

— Што такое інтэграцыя? Мы аб'ядноўваемся на аснове таго, што ў нас агульнае, а цікавіць нас тое, чым мы адрозніваемся адзін ад аднаго. Інтэграцыя — гэта спосаб атрымаць тое, чаго ў нас няма. Калі казаць пра Беларусь і пра беларускі досвед, то гэта сапраўды ўнікальны на прасторы СНД вопыт захавання сваіх здабыткаў.

### Ідэя ці грошы?

Падчас дыскусіі была закранута тэма якасці і прадавальнасці інфармацыйнага прадукту. Так, **Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда»**, адзначыў, што хоць кантэнт і павінен прадавацца, але вельмі важна, каб мы бачылі перад сабой не адну толькі задачу яго прадаць.

**Аляксей ВОЛІН, намеснік міністра сувязі і масавых камунікацый Расіі**, прытрымліваецца той думкі, што заўсёды неабходна арыентавацца на канчатковага спажыўца. На яго думку, нецікавыя тэксты ўвогуле не маюць права на існаванне.

— Сучасныя ўмовы патрабуюць ад СМІ вытворчасці толькі камерцыйна паспяховага кантэнту, — адзначыў ён. — Калі выраблeецца добры прадукт, але камерцыйна не паспяховы, то гэта будуць выкінутыя грошы. Спосаб дайсці да гледачоў, чытачоў толькі адзін — рабіць матэрыял якасна і цікава, і гэта датычыцца ў роўнай ступені ўсіх тэм. Нават калі гэта мемуары дзяржаўнага дзеяча, то яны павінны быць напісаны добрай мовай і выкладзены такім чынам, каб чытачу не хацелася адкласці кнігу.

### Прапаганда падмяняе журналістыку

**Павел НЯГОІЦА, генеральны дырэктар «Российской газеты»**, звярнуў увагу на той факт, што сённяшнія журналісты працуюць у вар'яцкім рытме. У іх няма часу асэнсаваць нейкую праблему, «падумаць, папрацаваць дзень-два, каб дакапацца да дадатковых крыніц».

Працягваючы яго думку, **Павел ЯКУБОВІЧ, галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия»**, сказаў, што часта карэспандэнты, спяшаючыся, не імкнуцца абдумаць пасылы сваіх матэрыялаў, а стараюцца зрабіць тэкст сенсацыйным. Такім чынам, выходзіць, што прапаганда падмяняе журналістыку, пры гэтым «байцы» інфармацыйнага фронту лічаць, што робяць гіганцкую справу.

— Насамрэч яны часта сваімі бяздумнымі выступленнямі падаграваюць канфлікты, якія тлеюць на тэрыторыях, у свядомасці людзей, што вельмі небяспечна, — сказаў Павел Якубовіч.

## Гавораць эксперты

***Паслухаем, як пра акутальныя пытанні медыяфоруму разважаюць яго ўдзельнікі.***



**Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ, старшыня Выканаўчага камітэта СНД:**

— Роля агульнай інфармацыйнай прасторы з кожным годам узрастае. Гэта звязана і з развіццём інфармацыйных тэхналогій, і з патрэбай насельніцтва ў асвятленні актуальных падзей. Свет сёння жыве ў вельмі хуткім тэмпе. Хацелася б, каб інфармацыя, што ідзе з экранаў тэлевізараў, гучыць па радыё, транслюецца ў інтэрнэце, друкуецца ў газетах, была аб'ектыўнай і пазітыўнай. Настрой жыхароў краіны залежыць ад таго, які паток інфармацыі яны атрымліваюць. Калі будуць пераважаць негатыўныя навіны, гэта можа прывесці да дэпрэсіі, самагубстваў. Але варта азірнуцца навокал, і можна заўважыць, што ў розных сферах жыцця грамадства шмат станоўчых момантаў. Вядома, сенсацыйныя негатыўныя факты выклікаюць большую цікавасць публікі, але СМІ не павінны спекуляваць гэтай заканамернасцю.

Хацелася б адзначыць актыўную ролю Беларусі ў інтэграцыйнай працы, у тым ліку ў межах СНД. І сённяшні медыяфорум — яшчэ адно яркае сведчанне гэтаму.



**Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы:**

— Жыццяздольнасць інтэграцыйных аб'яднанняў розных краін залежыць ад патрэб грамадства ў іх існаванні і дзейнасці. Думаецца, 20-годдзе Саюзнай дзяржавы — добры доказ важнасці існавання гэтага саюза. Але варта памятаць: у працэсе працы па інтэграцыі краін трэба звяртаць увагу не толькі на станоўчыя вынікі, але і адзначаць, якія рэзервы яшчэ не выкарыстаны, што не зроблена. Бо толькі так можна рухацца наперад. «Закалыхванне» сябе поспехамі — першая прыкмета таго, што развіцця няма. Таму падчас кожнай сустрэчы мы канцэнтруем асабліва пільную ўвагу не на поспехах, а на тым, што яшчэ варта зрабіць.

Як спажыўцу інфармацыйных матэрыялаў мне цікава, каб ніводная падзея не засталася без увагі з боку СМІ. Гэта не толькі сфера беларуска-расійскіх адносін, але і іншыя тэмы: падзеі ў Беларусі і Расіі, навіны эканомікі і палітыкі. У першую чаргу гаворка ідзе пра фактуру, новыя з'явы ў нашым жыцці.

Для дзяржаўных органаў, у тым ліку тых, што прадстаўляюць аб'яднанні, вельмі важна наладзіць адносіны з прэсай. Трэба, каб пра нас ведалі, нас разумелі. Бо вырашэнне любой задачы без інфармацыйнага суправаджэння амаль нерэальнае. Варта працаваць у галіне разбурэння міфаў, стэрэатыпаў, бо яны часам бываюць надзвычай устойлівыя.



**Аляксей ВОЛІН, намеснік міністра сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі:**

— Пагадненне аб стварэнні агульнай інфармацыйнай прасторы Расіі і Беларусі, план мерапрыемстваў якога абмяркоўваўся днямі падчас пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы, не мае на мэце прапаганду працы дзяржструктур. Яно прынясе карысць не ведамствам, а жыхарам Саюзнай дзяржавы: каб у любы момант у любым месцы зямнога шара яны маглі атрымаць звесткі пра падзеі ў Расіі і Беларусі. Таксама будуць рэалізоўвацца сумесныя праекты ў галіне тэлебачання, вытворчасці друкаваных СМІ, кнігавыдання, супрацоўніцтва інфармацыйных агенцтваў. Расія і Беларусь разам наладзяць змаганне з такімі з'явамі ў інтэрнэце, як дзіцячая парнаграфія, прапаганда наркаманіі, суіцыдаў, тэрарызм і экстрэмізм. Вельмі важны аспект дзейнасці — сумесная праца па падрыхтоўцы спецыялістаў галіны, а таксама сумесная вытворчасць кантэнту. Мы разумеем, што толькі цікавы, якасны змест уплывае на жыццяздольнасць, актуальнасць і папулярнасць медыя.



Фота Надзеі БУЖАН.

Марына ВЕСЯЛУХА, vesialuha@zviazda.by. Надзея ЮШКЕВІЧ, yushkevich@zviazda.by



Алфавіт у «Буквары» 1618 года.

■ Знаходка

# БЕЛАРУСКІ «БУКВАР» — У ТАМПЛІЕРАЎ!

**Старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша змог папрацаваць у прыватнай лонданскай бібліятэцы ордэна тампліераў і зрабіць там сенсацыйную знаходку — даказаць, што першы «Буквар» быў выдадзены на тэрыторыі колішняй беларускай дзяржавы.**

У свеце захаваліся толькі два асобнікі гэтага ўнікальнага выдання. Адзін з іх, няпоўны, знаходзіцца ў Даніі, у Каралеўскай бібліятэцы. А другі (поўны) экзэмпляр — у Вялікабрытаніі, у Бібліятэцы Мідл Тэмпла, (размяшчаецца ў гістарычным раёне Лондана Тэмпл, дзе некалі мелі сваю рэзідэнцыю славутыя рыцары-тампліеры).

Тое, што беларусу ўдалося трапіць туды, можна назваць сапраўднай удачай. Дагэтуль ні ў аднаго з айчынных даследчыкаў не было магчымасці ўбачыць «Буквар» на свае вочы (ва ўсякім разе, звестак пра гэта не захавалася). Алесь Суша адзначае:

— Дзякуючы спрыянню брытанскіх беларусістаў, прафесараў Лонданскага ўніверсітэта і перш за ўсё Джыма Дынглі, у мяне з'явілася магчымасць вывучыць гэты надзвычай каштоўны помнік нашай культуры і нават зрабіць некаторыя копіі.

На радзіме ніводнага асобніка не захавалася: іх проста «зачыталі да дзірак», як часта бывае з вучэбнымі выданнямі. Можна сказаць, нам пашанцавала, што адна з тых кніг яшчэ ў пачатку XVII стагоддзя была вывезена ў Лондан калекцыянерам вучэбных выданняў Робертам Эшлі. У далейшым яна трапіла ў закрыты для знешняга свету збор лонданскіх барыстараў (карпарацыю адвакатаў), дзе захоўваецца і сёння.

Даследчыку ўдалося высветліць, што гэтае выданне пабачыла свет 24 ліпеня 1618 года ў друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва ў Еўі — мястэчку ў Віленскай губерні, якое калісьці належала князям Агінскім. Гэта было адно з самых старадаўніх і ўплывовых беларускіх выдавецтваў у Вялікім Княстве Літоўскім, якое выпускала нямала кніг на царкоўнаславянскай, старабеларускай і польскай мовах. У 1619 годзе там была надрукавана «Граматыкі славенскія правілное сінтагма» Мялеція Смятрыцкага. А кніга, якую ўдалося ўбачыць Алесю Сушу, стала першай у свеце пад назвай «Буквар».

Навуковец адзначае, што ў 2018 годзе мы маем магчымасць адсвяткаваць 400-годдзе беларускага «Буквара». Да таго часу варта было б выпусціць факсімільнае выданне, правесці канферэнцыю, а таксама стварыць Музей буквара.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. nina@zviazda.by

■

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Мозырский НПЗ», 8(0236) 20 35 59

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (без НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 330/D-9730 площадью 35,9 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Нефтестроителей, д. 10-74. Однокомнатная квартира в 16-этажном кирпичном доме 1989 года постройки, расположена на 8-м этаже, площадью 8,03/17,91/35,9 кв.м, с/узел совместный, лоджия | **204 000 000** | **20 400 000** |
| 2 | - Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 330/D-9864 площадью 35,2 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Нефтестроителей, д. 10-108. Однокомнатная квартира в 16-этажном кирпичном доме 1989 года постройки, расположена на 12-м этаже, площадью 8,37/17,46/35,2 кв.м, с/узел совместный, лоджия | **200 000 000** | **20 000 000** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 24 мая 2016 г. в рабочие дни с 9[00] до 16[00] от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **26 мая 2016 г. в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, бульвар Юности, 1а, зал ДК ОАО «Мозырский НПЗ»** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.<br>Подробная информация содержится в ранее опубликованном извещении в газете «Звязда» от 18.02.2016 г. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by**

## ОАО «Промэлектромонтаж»

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 26 мая 2016 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об уменьшении уставного фонда Общества путем снижения номинальной стоимости простых (обыкновенных) акций.
2. О внесении изменений и дополнений в устав Общества и утверждении новой редакции устава.
3. Об утверждении локальных нормативных актов Общества.

Местонахождение ОАО «Промэлектромонтаж»: **г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.**

Место проведения собрания: **г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.**

Начало работы собрания **в 12.00.**

Регистрация участников собрания с 11.30 до 11.50 в день проведения собрания. При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 16 мая 2016 г.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 16.05.2016 г., по месту нахождения Общества.

Орган, созывающий общее собрание: совет директоров, основание созыва: протокол от 11.05.2016 № 11-05/2016.

*Совет директоров ОАО «Промэлектромонтаж»*

УНП 100088916

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «БИЛЕТЫ В ЛЕТО»

МОМО ТОРГОВЫЙ ЦЕНТР

**1. Организатор рекламной игры**.

Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова», далее именуемое «Организатор», 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 11, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191720959, свидетельство о государственной регистрации выдано 04.03.2013 г.

**2. Наименование рекламной игры** – «Билеты в лето».

**3. Территория проведения** – ТЦ «МОМО», расположенный по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Партизанский, 150А

**4. Срок начала рекламной игры – 16 мая 2016 года,**
**срок окончания – 22 июля 2016 года.**

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

**Председатель:** Щербакова Светлана Владиславовна – управляющий ТЦ «МОМО»

**Члены комиссии:**

Мудрая Ольга Анатольевна – ведущий специалист Управления торговыми Центрами иностранного унитарного производственно-коммерческого предприятия «БелВиллесден»

Шамаль Дмитрий Эдуардович – директор ООО «Смарт Нова»

Кулинкович Александр Анатольевич – заместитель директора ООО «Смарт Нова»

Потеря Александр Николаевич – заведующий хозяйством ООО «Смарт Нова»

**6. Цель Игры.**

Рекламная игра «Билеты в лето» проводится в целях продвижения товаров и услуг, реализуемых в следующих магазинах, расположенных на территории торгового центра « МОМО» (далее – ТЦ «МОМО»):

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 7 КАРАТ | 19 | Мерси (нейл-бар) | 37 | Эникейс | 55 | Varvara |
| 2 | Colin's (одежда) | 20 | Кофейня Пронто | 38 | ZIKO | 56 | Urbano |
| 3 | LCWaikiki (одежда) | 21 | 585 | 39 | Чай, кофе | 57 | LUBAWA |
| 4 | ЭЛЕКТРОСИЛА | 22 | Букваешка | 40 | SELA | 58 | Авила |
| 5 | Цифровой Фото Экспресс | 23 | Артимода | 41 | Marko (обувь) | 59 | Джакетта |
| 6 | Акварель (химчистка) | 24 | СпивакЪ | 42 | Rylko | 60 | Ачоса |
| 7 | САМ-МАСТЕРС | 25 | Островок (подарки) | 43 | ТВОЕ | 61 | Лауфер |
| 8 | Ателье по ремонту одежды | 26 | Хэлс энд Бьюти | 44 | Broadway | 62 | Galanteya |
| 9 | Hunkemoller (белье) | 27 | Аркада | 45 | ГЛО-Стори | 63 | Eliz |
| 10 | Jenavi | 28 | Флормар (косметика) | 46 | Mark Formelle | 64 | RESPECT |
| 11 | Фрэш Лайн сэндвич-бар | 29 | Оптика ВДЛ | 47 | RIEKER | 65 | Sister's |
| 12 | Valeon | 30 | Планета косметики | 48 | Mothercare | 66 | Анна Виктория (бижутерия) |
| 13 | Орехи сухофрукты | 31 | Салон цветов «Ирис» | 49 | Бювет | 67 | Бэг Стрит |
| 14 | Baskin Robbins | 32 | diva (аксессуары) | 50 | Арт песочница | 68 | TomFarr |
| 15 | Парти Микс | 33 | DAROO | 51 | Буслик | 69 | МАКЕЙ |
| 16 | MILE | 34 | Империя Украшений | 52 | Карика | 70 | Рыболов (Резвая рыбка) |
| 17 | CINNABON | 35 | Гудок-бай | 53 | Калинка | 71 | АэроХоккей |
| 18 | YVES ROCHER | 36 | Планета подарков | 54 | Проспорт | 72 | Бьюти Косметик |
| 73 | Milavitsa (белье) | 74 | Адидас | 75 | Шаговита | 76 | Том (детская одежда) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 77 | МАМАДОМА – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* | 78 | Кафе ГАРАЖ – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* |
| 79 | Бургер Мастер – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* | 80 | Воккер – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* |
| 81 | Эф Си кафе – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* | 82 | Ветеринарная аптека Доктор Вет – *кроме лекарственных средств* |
| 83 | Вуаль (белье) | 84 | Фэшн Леди (белье) |
| 85 | Игрушки | | |

**7. Условия участия и порядок отбора участников рекламной игры.**

К участию в рекламной игре допускаются граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет.

Участниками Игры не могут быть члены Комиссии, лица, состоящие в трудовых отношениях с организатором, их супруги, близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства, а также лица, состоящие в трудовых отношениях с арендаторами торговых площадей в ТЦ «МОМО». Для участия в рекламной игре потребитель должен с 9.00 16 мая 2016 года по 16.00 8 июля 2016 года совершить покупки или оплатить услуги на сумму не менее 1 000 000 белорусских рублей в участвующих в игре торговых объектах ТЦ «МОМО» (чеки из разных магазинов ТЦ «МОМО» суммируются, если покупки совершены в один день), зарегистрировать чек (чеки) на промостойке игры «Билеты в лето» в ТЦ «МОМО» и заполнить специальный купон рекламной игры. Купон участника рекламной игры содержит следующие обязательные для заполнения поля: «Номер участника», «Номер чека», «Фамилия», «Имя», «Отчество», «Адрес проживания», «Контактный телефон», «Дата заполнения», «Подпись». Промо-стойка работает на инфоцентре ТЦ «МОМО» с 16 мая 2016 года по 7 июля 2016 года ежедневно с 10 часов до 20 часов, 8 июля 2016 года – с 10 часов до 16 часов. Чеки можно зарегистрировать только в день совершения покупки. Если хоть одна из покупок в сумме чеков совершена с 20 часов до момента закрытия ТЦ «МОМО», то чеки можно зарегистрировать на следующий день. Покупки должны быть совершены с 9.00 16 мая 2016 года до 16.00 8 июля 2016 года.

Количество купонов, предоставляемых к заполнению, соответствует количеству полных миллионов в чеке (сумме чеков), предъявленных к регистрации. К регистрации путем суммирования чеков от одного участника в течение одного дня принимаются только чеки из разных торговых точек, участвующих в рекламной игре. Одна часть купона остается у участника, вторая вбрасывается в ящик для розыгрыша. Один участник в течение рекламной игры может заполнять неограниченное количество купонов. Участник обязан сохранять чек(чеки) вместе с купонами. Участник в момент розыгрыша имеет право находиться в ТЦ «МОМО» и наблюдать за розыгрышем, а также принимать в нем участие.

**Список торговых объектов, участвующих в рекламной игре.**


| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 7 КАРАТ | 19 | Мерси (нейл-бар) | 37 | Эникейс | 55 | Varvara |
| 2 | Colin's (одежда) | 20 | Кофейня Пронто | 38 | ZIKO | 56 | Urbano |
| 3 | LCWaikiki (одежда) | 21 | 585 | 39 | Чай, кофе | 57 | LUBAWA |
| 4 | ЭЛЕКТРОСИЛА | 22 | Букваешка | 40 | SELA | 58 | Авила |
| 5 | Цифровой Фото Экспресс | 23 | Артимода | 41 | Marko (обувь) | 59 | Джакетта |
| 6 | Акварель (химчистка) | 24 | СпивакЪ | 42 | Rylko | 60 | Ачоса |
| 7 | САМ-МАСТЕРС | 25 | Островок (подарки) | 43 | ТВОЕ | 61 | Лауфер |
| 8 | Ателье по ремонту одежды | 26 | Хэлс энд Бьюти | 44 | Broadway | 62 | Galanteya |
| 9 | Hunkemoller (белье) | 27 | Аркада | 45 | ГЛО-Стори | 63 | Eliz |
| 10 | Jenavi | 28 | Флормар (косметика) | 46 | Mark Formelle | 64 | RESPECT |
| 11 | Фрэш Лайн сэндвич-бар | 29 | Оптика ВДЛ | 47 | RIEKER | 65 | Sister's |
| 12 | Valeon | 30 | Планета косметики | 48 | Mothercare | 66 | Анна Виктория (бижутерия) |
| 13 | Орехи сухофрукты | 31 | Салон цветов «Ирис» | 49 | Бювет | 67 | Бэг Стрит |
| 14 | Baskin Robbins | 32 | diva (аксессуары) | 50 | Арт песочница | 68 | TomFarr |
| 15 | Парти Микс | 33 | DAROO | 51 | Буслик | 69 | МАКЕЙ |
| 16 | MILE | 34 | Империя Украшений | 52 | Карика | 70 | Рыболов (Резвая рыбка) |
| 17 | CINNABON | 35 | Гудок-бай | 53 | Калинка | 71 | АэроХоккей |
| 18 | YVES ROCHER | 36 | Планета подарков | 54 | Проспорт | 72 | Бьюти Косметик |
| 73 | Milavitsa(белье) | 74 | Адидас | 75 | Шаговита | 76 | Том (детская одежда) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 77 | МАМАДОМА – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* | 78 | Кафе ГАРАЖ – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* |
| 79 | Бургер Мастер – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* | 80 | Воккер – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* |
| 81 | Эф Си кафе – *кроме алкогольных, слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий* | 82 | Ветеринарная аптека Доктор Вет – *кроме лекарственных средств* |
| 83 | Вуаль (белье) | 84 | Фэшн Леди (белье) |
| 85 | Игрушки | | |


**8. Состав и размер призового фонда.**

| № | Наименование приза | шт. | Цена единицы | Общая стоимость |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Сертификат «Тур в Испанию»:**<br>Кол-во человек 4<br>Сроки тура 10.09.2016 – 01.01.2016<br>Курорт Калафелль, Коста Дорада, Испания<br>Перелет Вильнюс – Барселона – Вильнюс<br>Проживание: Apartment T3<br>Питание: без питания<br>Дополнительные услуги:<br>1. Трансфер Минск – Вильнюс – Минск (4 человека)<br>2. Трансфер аэропорт Барселона – Сегур де Калафелль – аэропорт Барселона (4 человека)<br>3. Страхование медицинское 10.09.2016 – 01.01.2016 | 1 | 85 658 800 | 85 658 800 |
| 2 | Денежный приз | 16 | 1 000 000 | 16 000 000 |
| 3 | Сертификат на покупку в магазине «Varvara». Срок действия сертификата до 31 июля 2016 г. | 4 | 1 000 000 | 4 000 000 |
| 4 | Сертификат на покупку в магазине «Респект». Срок действия сертификата до 01 сентября 2016 г. | 4 | 1 000 000 | 4 000 000 |
| 5 | Сертификат на покупку в магазине «Mark Formelle». Срок действия сертификата 3 месяца с момента получения сертификата победителем | 4 | 1 000 000 | 4 000 000 |
| 6 | Пакет из 10 сертификатов (по 100 000 руб.) на покупку в магазине «Галантея». Срок действия сертификата до 22 октября 2016 г. | 4 | 1 000 000 | 4 000 000 |
| | ИТОГО: | | | 117 658 800 |

Сумма призового фонда составляет 117 658 800 (Сто семнадцать миллионов шестьсот пятьдесят восемь тысяч восемьсот) белорусских рублей.

Призовой фонд сформирован за счет средств заинтересованных лиц:

1. Иностранного унитарного производственно-коммерческого предприятия «БелВиллесден» – денежные призы на общую сумму 16 000 000 (Шестнадцать миллионов) рублей и приз сертификат «Тур в Испанию».
2. ЧП «Милори стиль» – сертификаты на покупку в магазине «Varvara»
3. ООО «Эрикана» – сертификаты на покупку в магазине «Респект»
4. ООО «Формель» – сертификаты на покупку в магазине «Mark Formelle»
5. ОАО «Галантея» – пакеты из 10 сертификатов на покупку в магазине «Галантея»

**9. Место, дата, время и порядок розыгрышей призов, порядок определения выигравших основные призы участников рекламной игры «Билеты в лето».**

Розыгрыши призов проводятся в ТЦ «МОМО» (Минск, проспект Партизанский, 150а) на втором этаже в красном атриуме по следующему графику:

**Розыгрыш 1 — 27 мая 2016 года в 17.00**, принимают участие купоны, зарегистрированные в период с 10.00 16 мая 2016 года до 16.00 27 мая 2016 года, разыгрывается 8 призов:

четыре денежных приза по 1 000 000 рублей, сертификаты: «Varvara» «Галантея», «Респект», «Mark Formelle».

**Розыгрыш 2 — 10 июня 2016 года в 17.00**, принимают участие купоны, зарегистрированные в период с 16.00 27 мая 2016 года до 16.00 10 июня 2016 года, разыгрывается 8 призов:

четыре денежных приза по 1 000 000 рублей, сертификаты: «Varvara», «Галантея», «Респект», «Mark Formelle».

**Розыгрыш 3 — 24 июня 2016 года в 17.00**, принимают участие купоны, зарегистрированные в период с 16.00 10 июня 2016 года до 16.00 24 июня 2016 года, разыгрывается 8 призов:

четыре денежных приза по 1 000 000 рублей, сертификаты: «Varvara», «Галантея», «Респект», «Mark Formelle».

**Розыгрыш 4 – 8 июля 2016 года в 17.00**, принимают участие купоны, зарегистрированные в период с 16.00 24 июня 2016 года до 16.00 8 июля 2016 года, разыгрывается 8 призов:

четыре денежных приза по 1 000 000 рублей, сертификаты: «Varvara», «Галантея», «Респект», «Mark Formelle».

**Розыгрыш 5 – 8 июля 2016 года сразу вслед за розыгрышем 4,** принимают участие купоны, зарегистрированные в период с 10.00 16 мая 2016 года до 16.00 8 июля 2016 года, но не выигравшие в предыдущих розыгрышах, разыгрывается главный приз – Сертификат «Тур в Испанию».

**Механика розыгрышей:**

Обладатель приза определяется из числа участников рекламной игры путем случайного извлечения членом комиссии или приглашенным посторонним лицом из лототрона купона участника рекламной игры. Перед розыгрышем 5 в лототрон загружаются все купоны, принимавшие участие, но не выигравшие, в предыдущих розыгрышах.

**10. Место, порядок и сроки выдачи призов и уведомления победителей.**

Вручение призов будет осуществляться сразу после проведения розыгрыша по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, 150а. Призы вручаются по предъявлению победителем паспорта, своей части купона и чека (чеков). Если в момент проведения розыгрыша победитель не присутствует на розыгрыше, он будет уведомлен организатором о выигрыше в течение 5 рабочих дней после проведения розыгрыша по почте и по телефону.

Победитель может получить приз в офисе организатора в любой рабочий день до 22 июля 2016 года включительно с 12 до 17 часов по адресу Минск, ул. Сторожевская, 8, к. 11. Победители могут передать право на получение и использование приза другому лицу. В этом случае победитель должен предоставить Организатору отказ от получения приза и передать право на приз другому лицу в письменном виде не позднее 21 июля 2016 года.

Денежная компенсация стоимости приза не производится.

**11. Порядок информирования об условиях и результатах Игры.**

Правила рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала рекламной игры, а также на сайте momo-center.by. Результаты розыгрыша призов будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 18 июля 2016 года, а также на сайте momo-center.by.

**12. Общие условия рекламной игры.**

Участвуя в рекламной игре, ее участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии могут быть использованы в рекламных целях Организатора без уплаты какого-либо вознаграждения участникам в рамках данной рекламной игры. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в рекламной игре.

В случае отказа участника от получения приза или неполучение приза в установленные в настоящих правилах сроки, приз остается у Организатора и используется им по своему усмотрению.

Результаты игры будут являться окончательными и не могут быть оспорены.

Участники рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые организатором рекламной игры для получения призов.

Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы непосредственно Организатору рекламной игры по адресу: 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 11.

Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

Приз получает участник розыгрыша, имя которого указано в купоне, который оказался выигрышным. Участник вправе распорядится полученным призом по своему усмотрению.

Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Участник самостоятельно несет ответственность за соблюдение им действующего законодательства в сфере налогообложения.

Участие в рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие участников с настоящими правилами рекламной игры.

**Телефон информационной линии: 8 (029) 620-86-73.**
**Время работы информационной линии: с 14.00 до 18.00.**

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры «БИЛЕТЫ В ЛЕТО» №2748 выдано Министерством торговли Республики Беларусь 4 мая 2016.

■ Сямейная школа

# БАБУЛЯ... ЗА ГРОШЫ

## Як аформіцца нянькай у сям'ю ўласных дзяцей

**Так павялося, што нашы клапатлівыя бабулі са з'яўленнем унукаў становяцца звычайна не толькі крыніцай невычэрпнай любові і пяшчоты, а і службай кругласутачнай псіхалагічнай і фізічнай падтрымкі, банкам дадатковага фінансавання і энцыклапедыяй ва ўсіх сферах жыцця. Яны робяць гэта альтруістычна і нават не здагадваюцца, што могуць дапамагаць дзецям, у якіх з'явілася адразу двое-трое ці больш немаўлят, за бюджэтныя грошы і працоўны стаж.**



Кацярына МАЛЬЦАВА.

### Няма часу старэць

Пакуль пры Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей працуе толькі адна шчаслівая бабуля-нянька Святлана ПАЗНЯК, якую ўгаварыў уладкавацца ўласны муж. Самой ёй спачатку было крыху няёмка. Усё ж такі свае ўнукі, яна б і так імі займалася, а тут яшчэ і грошы за гэта плаціць.

— Стаўшы нянькай для ўнукаў, я пэўны час перажывала, як гэта так — атрымліваць заробак за догляд сваіх жа. Цяпер разумею, што хай гэта і не вялікія грошы, але іх хапае для аплаты, напрыклад, гуртка дачкі, — разважае жанчына.

Маладая 48-гадовая бабуля нарадзіла ўласнае другое дзіця ў 38 гадоў. Калі дачка пайшла ў першы клас, Святлана Уладзіміраўна пакінула працу, бо не паспявала па часе забіраць малую са школы, на гурткі вадзіць, і ўвогуле, так было больш зручна. А літаральна праз паўтара года з'явіліся ўнукі, і яна зноў апынулася пры справе.

— Спачатку, калі даведалася пра цяжарнасць, было нават страшна, ці хопіць сіл выгадаваць у такім узросце, — успамінае яна. — Потым зразумела, як цудоўна, калі на табе адказнасць. Ну чым бы я займалася зараз? Праца, дом, вечар на канапе перад тэлевізарам у чаканні пенсіі. А тут маленькая дачка, унукі, і няма часу старэць.

Пра цудоўную навіну сын і нявестка сям'і Пазняк паведамілі творча. Прынеслі бацькам два падарункавыя пакецікі і раздалі будучым бабулі і дзядулі. У кожным ляжала па пінетцы і палове разрэзанага хвалістай лініяй здымка з вынікам УГД. Чакалі хвалюючую падзею без нервавання і жаху.

> **Дзіця, якое мяркуецца пакінуць з «нянькай на гадзіну», павінна быць накормлена і не хацець спаць. Дзённы сон, як і кармленне, у цэнтры не прадугледжаны.**

— Па Таццяне відаць ужо было, што яна гатовая стаць мамай, і ёй гэтага хочацца. А тут яшчэ адразу такі двайны падарунак. Цяпер і не ўяўляю сабе, як бы гэта было толькі з адным малым завіхацца, — смяецца Святлана Уладзіміраўна. — З двума праўда цяжкавата гуляць па вуліцы, бо яны распаўзаюцца ў розныя бакі. Адзін на арэлі хоча, другая ў пясочніцу. Але ж нічога, прывыкаеш. Тым больш што яны, здаецца, адчуваюць, калі трэба перастаць свавольнічаць. Скажам, Мішу трэба больш увагі, бо ў яго баліць жывот, дык Кацю будзе паводзіць сябе як шоўкавая, нібы разумее, што зараз час паклапаціцца пра брацікa. І ён перастае гарэзнічаць, калі бачыць, што нездаровіцца сястрычцы.

Графік працы бабулі-нянькі ссоўваецца па меры неабходнасці і ў залежнасці ад патрэб і па часе, і па днях. Святлана Уладзіміраўна адказна ставіцца да сваёй пасады і можа адпрацаваць неабходную колькасць гадзін і позна вечарам, і ў свой выхадны. Хоць зразумела, што ўласная бабуля праводзіць з унукамі значна больш часу, чым абавязковыя рабочыя 20 гадзін у тыдзень.

— Калі б я працавала ў чужой сям'і, я таксама б ішла насустрач бацькам па змяненні гадзін графіка, бо разумею, што хочацца і выйсці кудысьці, і пабыць удваіх у выхадны, — мяркуе Святлана Пазняк.

Ці будзе працягваць працаваць нянькай з іншымі дзеткамі, «патрэбнымі» на ўласных унуках, яна пакуль не ведае. Аднак жанчына ўпэўнена, што яе педагагічная адукацыя (адна з дзвюх) — добрая падтрымка ў любові да дзяцей: сваіх і чужых.

### Пагуляе на вуліцы і адвязе на гурток

У самім сталічным цэнтры абслугоўвання сям'і і дзяцей паслуга нянькі наведвальнікам таксама прадастаўляецца. Пакуль установа знаходзіцца на арандуемай плошчы і не валодае спецыяльна абсталяваным пакоем для працы з дзецьмі, яна бясплатная.

Цяперашнія нянькі — спецыялісты па сацыяльнай рабоце, кожны з якіх мае псіхалагічную адукацыю. Яны займаюцца з малечай, пакуль дарослыя, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі, кансультуюцца ў спецыяліста.

— Мы аказваем сацыяльна-псіхалагічныя паслугі. І нашы заняткі не педагагічныя, а, хутчэй, рэабілітацыйныя, напрыклад, праз сродкі арт-тэрапіі. Ужо на падставе малюнкаў мы можам даць пэўныя рэкамендацыі маме, як паводзіць сябе з малым, — расказала **Кацярына МАЛЬЦАВА, дырэктар Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.**

Сёлета цэнтр плануе пераехаць у новы будынак, дзе два пакоі будуць абсталяваны па ўсіх нормах заняткаў з дзецьмі. У кожным адначасова зможа знаходзіцца 4-5 малых ва ўзросце 2-4 гадоў і 4-6 гадоў. Такія «нянькі на гадзіну» ўжо будуць платнымі. Пакуль кошт разлічваецца ў памеры 66 000 рублёў за гадзіну.

— На 1-3 гадзіны маці змогуць пакінуць дзяцей з нашымі спецыялістамі-нянькамі, якія не проста пагуляюць з малымі, а зоймуцца з імі развіваючай інтэлектуальнай дзейнасцю, у прыватнасці, арт-тэрапіяй, — паведаміла дырэктар.— Іх матулі ў гэты час змогуць з'ездзіць на заняткі ці да ўрача, зрабіць пакупкі, наведаць цырульню, нарэшце, проста крыху адпачыць і пасядзець у цішыні або пагаварыць з сяброўкай.

На новым месцы нянькі змогуць клапаціцца пра малых не толькі ў цэнтры, але і выязджаць дадому да бацькоў, каб пагуляць з дзіцем па вуліцы альбо развесці малых па гуртках.

— Мне здаецца, такая паслуга будзе запатрабавана. У мамы часта не хапае часу, асабліва калі дзетак шмат, альбо на руках немаўля, — мяркуе Кацярына Мальцава. — За час, пакуль малых на гуртку адвязе нянька, матулі змогуць, напрыклад, вырашыць нейкія бытавыя пытанні, што доўгі час адкладваліся.

**Ірына СІДАРОК**



**Даведка «Звязды»**

**Пасада нянькі для падтрымкі сем'яў, дзе адначасова нарадзілася двойня ці трайня, арганізавана пры Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Гэта 0,5 стаўкі (4-гадзінны працоўны дзень), аформіцца на якую могуць бацькі, сёстры і іншыя родзічы маладой маці. Пры гэтым нянька-сваячка можа сумяшчаць догляд за дзецьмі з асноўнай працай альбо працягваць такім чынам свой стаж, калі яна ўжо на пенсіі. Прывабнасць і неверагоднасць такой пасады яшчэ і ў тым, што яна знаходзіцца па-за межамі тарыфнай сеткі, і колькасць падобных працоўных месцаў не абмяжоўваецца. Дастаткова наяўнасці мінімум двух дзетак адразу і жадання сваяка.**

# Спачатку — штамп...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Нягледзячы на тое, што колькасць жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту зніжаецца, немаўлят з года ў год нараджаецца ўсё больш. Так, летась нарадзілася 119 тысяч дзяцей. Гэта самі высокі паказчык за ўсю гісторыю Беларусі. Тэндэнцыя, бадай, захавaецца і сёлета: за першы квартал ужо нарадзілася на 4,5 працэнта дзяцей больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Павялічваецца склад сем'яў. 57 працэнтаў малых з'яўляюцца другімі і наступнымі. А колькасць шматдзетных сем'яў з 2009 года вырасла прыкладна на 17 тысяч (цяпер іх больш за 80 тысяч).

Усяго ў краіне налічваецца каля 2 мільёнаў 700 тысяч сем'яў. З іх 1,2 мільёна (амаль 45 працэнтаў) маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

### Выплаты атрымлівае траціна дзяцей

Што да дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, то значныя захады былі прыняты ў апошнія гады ў рамках рэалізацыі Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. У прыватнасці, павялічылі памеры дапамог па доглядзе за дзецьмі, увялі дадатковыя меры матэрыяльнай падтрымкі.

Істотныя з'яўляюцца выплаты ў сувязі з нараджэннем малога. Сёння за першынца беларускія матулі атрымліваюць па 10 бюджэтаў пражытковага мінімуму, ці амаль 17 мільёнаў рублёў, а за нараджэнне другога і наступнага — 14 БПМ (каля 23,8 мільёна). Летась з'явілася дадатковая заахвочвальная дапамога на дзяцей ад 3 да 18 гадоў, калі ў сям'і выхоўваецца яшчэ адзін малы да трох гадоў. Яе памер складае цяпер 850 тысяч у месяц.

Усяго выплаты (іх 11 відаў) атрымліваюць больш за 30 працэнтаў дзяцей. Пры гэтым малыя ва ўзросце да трох гадоў ахоплены практычна цалкам. Актыўна звяртаюцца бацькі па сямейны капітал. На пачатак мая адкрыта 17 760 дэпазітных рахункаў. Іх агульная сума перавышае 177 мільёнаў долараў.

Развіваецца сістэма сацыяльнага абслугоўвання сем'яў. Самымі запатрабаванымі з'яўляюцца паслугі нянькі. Калі ў 2014 годзе тэрытарыяльныя цэнтры вылучылі работніка для догляду за дзецьмі 889 сем'ям, то летась — 1403-м. У першым квартале гэтага года паслугай ужо скарысталася каля 1300 сем'яў.

### «Дэкрэтны» для татаў стане абавязковым?

Па індэксе мацярынства Беларусь займае 25 пазіцыю сярод 179 краін. А ў СНД — на першым месцы. Сямейная палітыка будзе ўдасканальвацца і далей. У наступную пяцігодку больш увагі ўдзеляць падрыхтоўцы моладзі да шлюбу, развіццю сямейнага адпачынку. А водпуск для бацькі па доглядзе за малым з 2017 года магчыма зробяць абавязковым. Дэпутаты ўжо звярталіся ў міністэрства з такой прапановай.

> **Калі ў 2005 годзе першынца жанчыны нараджалі ў 23,9 года, то цяпер — ужо ў 26. На другое дзіця маці звычайна рашаюцца ва ўзросце 30,6 года.**

— Чаму ўздымаецца гэта пытанне? Летась у водпуску па доглядзе за дзіцем да трох гадоў знаходзілася крыху больш за тры тысячы мужчын. Гэта, заўважце, і таты, і дзядулі. Зусім нямнога: каля аднаго працэнта ад усіх, хто быў у водпуску. На мой погляд, роля бацькі ў выхаванні маленькага дзіцяці недаацэньваецца, як грамадствам, так і самімі мужчынамі, — кажа Марына Арцёменка.

Замежны вопыт паказвае, што там, дзе ёсць абавязковы бацькоўскі «дэкрэтны», правам даглядаць за малым да трох гадоў карыстаецца 80 працэнтаў татаў. Як гэту норму будуць уводзіць у нас, пакуль абмяркоўваецца. Магчыма, прапішуць адпаведны абавязак у Генеральным пагадненні ўрада, прафсаюзаў і наймальнікаў ці распрацуюць заахвочвальныя механізмы аплаты такога водпуску.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

■ Ведай нашых!

# «ЗАЛАТЫ» ГОЛАС ВАЛЕРЫІ

**Пра юную вакалістку з Магілёва Валерыю Азаранку газета пісала неаднойчы. Яна — пераможца шматлікіх прэстыжных музычных конкурсаў. І вось чарговая перамога. На гэты раз ёй дасталася золата XIV міжнароднага дзіцячага конкурсу вакалістаў «Залаты мікрафон», які праходзіў у канцы красавіка ў Казахстане.**

У намінацыі 14-17 гадоў Валерыі не было роўных. За галоўны прыз «Залатога мікрафона» на працягу трох дзён змагаліся 74 салісты з Беларусі, Расіі, Казахстана, Узбекістана і Літвы. Валерыя была самай малодшай у дарослай катэгорыі. За 2 творы, якія яна выканала, усе члены журы паставілі ёй 10 балаў з 10 магчымых.

Юная спявачка займаецца ў студыі эстраднага вакалу пры Магілёўскай гарадской гімназіі №1. Яе педагог — салістка Магілёўскай абласной філармоніі Вольга Гарнічар. На конкурс у Казахстан яна паехала са сваёй вучаніцай як ганаровая госця.

Дарэчы, Валерыя Азаранка з'яўляецца тварам праекта «Азбука беларускага арнаменту», які да Года культуры прапанавала ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама. Яго мэта — інтэграцыя беларускай культуры ў сусветную культурную прастору.



**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

# АБ'ЕКТЫЎНА І АДКАЗНА

**Прадстаўнікі сілавых структур, якія адказваюць за сувязі са сродкамі масавай інфармацыі і з грамадскасцю, — аб стаўленні да людзей у пагонах і асаблівасцях узаемадзеяння органаў нацыянальнай бяспекі са СМІ**

**У канферэнц-зале «Звязды» ў «круглым стале» прынялі ўдзел начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю цэнтральнага апарату Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ, памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях, прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ, начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў — прэс-сакратар Міністэрства ўнутраных спраў Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сяргей КАБАКОВІЧ.



Уладзімір МАКАРАЎ.



Віталь НАВІЦКІ.



Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ.

## НОВЫ ГУЛЕЦ — АНАНІМНЫ ЭКСПЕРТ

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — На працягу жыцця звычайны чалавек узаемадзейнічае з людзьмі ў пагонах. І не заўсёды атрымліваецца так, што гэты чалавек адэкватна рэагуе на дапамогу сілавых структур. Часам ён зусім не ўспрымае дзейнасць супрацоўніка ў пагонах або ваеннаслужачага.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Калі пачаць з апытанняў грамадскай думкі, то адным з галоўных крытэрыяў ацэнкі работы органаў унутраных спраў ужо больш за 10 гадоў з'яўляецца ступень даверу грамадзян. Staноўчыя матэрыялы аб сілавым блоку ў большай ступені ўплываюць на станоўчае меркаванне на месцах. Я некалі непасрэдна ўдзельнічаў у апытанні грамадскай думкі. Мы ездзілі з відэакамерай па рэгіёнах. І трэба сказаць, што не было нічога больш складанага, чым знайсці чалавека, які негатыўна выкажацца аб міліцыі. Думаю, што тая ж карціна ў рэгіёнах і сёння. Я маю на ўвазе меркаванне людзей, якія не здзяйснялі супрацьпраўных дзеянняў і бачаць работу міліцыі збоку. Іншая справа, што ёсць парушальнікі грамадскага парадку. Яны заўсёды «невінаватыя», і ім увесь час ёсць што сказаць, асабліва ў інтэрнэце. Натуральна, гэта абарончая рэакцыя людзей, якія прыцягваюцца да адказнасці. Можа, парушальнікам грамадскага парадку трэба часцей аглядацца на саміх сябе, а журналістам падыходзіць да такіх сітуацый больш лаяльна?

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Не сакрэт, што ў цяперашні час многія карыстаюцца гаджэтамі і амаль кожны лічыць сябе журналістам. Чалавек здольны зняць любыя дзеянні, выразаць іх з кантэксту і падаць інфармацыю так, як яму хочацца. Гэта не гаворыць аб тым, што ў яго прысутнічае жаданне зганьбаваць чыёсьці сумленнае імя. Гэта сведчанне, што чалавек не заўсёды суадносіць свае інтарэсы з грамадствам. Не зусім правільна паказваць тыя ці іншыя дзеянні супрацоўніка міліцыі або расказваць пра тое, як следчы праводзіць пэўныя следчыя дзеянні. Не заўсёды карэктна раіць Міністэрству па надзвычайных сітуацыях, як неабходна тушыць пажар. Гэтым займаюцца спецыялісты, прафесіяналы, якія вучацца доўгі час, каб дапамагаць нашым грамадзянам.

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — Каб забяспечыць абарону Айчыны, неабходна мець ваенны навучаны рэзерв. Ваенна-ўліковая спецыяльнасць атрымліваецца ў ходзе тэрміновай службы, службы ў рэзерве, падчас навучання ў вышэйшых навучальных установах на ваенных кафедрах або ваенных факультэтах. Абараняць Радзіму павінны ўмець усе. Ёсць меркаванне, што нам трэба ўвесці льготу для настаўнікаў, каб яны ўвогуле не служылі ў арміі. Бо, маўляў, малады чалавек з вышэйшай адукацыяй, адслужыўшы год або ў рэзерве, потым не вяртаецца ў школу. Дык лепш няхай там настаўнічае жанчына. Паважаючы органы нацыянальнай бяспекі і сілавыя структуры, яна прынясе ў шмат разоў больш карысці, чым малады чалавек, які будзе разумець, што ён пайшоў у армію для таго, каб замест яго нехта выконваў функцыі па абароне Айчыны.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Перш за ўсё, трэба разумець, што кожны з органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў цэлым займаецца пытаннямі ўдасканалення сваёй дзейнасці, павышэння ўзроўню дысцыпліны, адбору кадраў, супрацьдзеяння карупцыйным праявам. Але пры гэтым колькасць негатыву ў інтэрнэт-СМІ чамусьці расце. І гэта ўсё не таму, што ў гэтых органах работа стала весціся горш. А таму, што на экспертным полі з'явіўся новы гулец, якога можна назваць ананімным экспертам. На жаль, з гэтым ананімным экспертам нам усім даводзіцца ледзь не на роўных мець зносіны. З безназоўнымі нікамі, акаўнтамі, якія ўкідваюць у інтэрнэт-прастору самую розную інфармацыю, на якую мы абавязаны рэагаваць.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Існуюць нават спланаваныя акцыі, накіраваныя на тое, каб дыскрэдытаваць супрацоўнікаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Таму вельмі важна, што мы можам падаваць першасную інфармацыю. Падаваць пад тым вуглом, які аб'ектыўна паказвае работу праваахоўных органаў і органаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі краіны. Каб потым тая сітуацыя, якая з'яўляецца правапарушэннем або пэўнай надзвычайнай сітуацыяй, не паказвалася як хлуслівая, дадуманая і перавернутая.

**«Заходнюю Еўропу захапіла тое, што называецца постмадэрнізмам — філасофскім кірункам са змешваннем жанраў і стыляў. Фарміруецца мазаічнае ўспрыняцце рэальнасці, так званае кліпавае мысленне. Гэта падобна на тое, як у вядомай казцы, калі Кашчэй Бессмяротны выставіў адну жывую царэўну і дзевяць яе шкляных копій і прапанаваў Івану Царэвічу разбіць іх».**

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — Напэўна, усе гэтыя пытанні нам трэба разглядаць у кантэксце абароны нацыянальных інтарэсаў, сыходзячы з выклікаў і рызык, якія зараз прысутнічаюць. Яны аб'ектыўныя, абумоўленыя глабальнымі працэсамі, у якія ўбудавана Беларусь. Ва ўмовах адкрытай сусветнай эканомікі і самай адкрытай інфармацыйнай прасторы падтрымліваць мір і стабільнасць дарагога каштуе. І па вялікім рахунку, гэта ўплывае на свядомасць нашых грамадзян, якія, нягледзячы на распаўсюджванне ў «незалежных» сродках масавай інфармацыі розных тэзісаў, паважалі і паважаюць усе сілавыя структуры. Мы зробім усё, каб так было заўсёды.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Наша задача заключаецца ў тым, каб у кожнага грамадзяніна і ў цэлым у грамадстве захоўвалася ўсё-такі правільнае разуменне, што на варце закону, правапарадку і бяспекі краіны стаяць прафесіянальныя, сумленныя, добрапрыстойныя служачыя, ваеннаслужачыя, супрацоўнікі.

## ПОСТМАДЭРНІЗМ У ВІРТУАЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Нам неабходна агульнымі намаганнямі перааджоўваць такія тэндэнцыі, калі звычайны чалавек, тынэйджар, які лічыць сябе блогерам, прафесіяналам у медыясферы, здымае пэўныя дзеянні, а потым іх распаўсюджвае. Прычым пад такім вастрыём, што грамадскасці гэтая інфармацыя падаецца як негатыўная. Але яны не кажуць пра тое, што малады чалавек, які адслужыў у арміі, атрымаў там спецыяльнасць, умее трымаць у руках зброю і навучаны абараняць Радзіму. Што міліцыянер, які ахоўвае грамадскі парадак на вуліцы, — той чалавек, да якога, калі нешта здарыцца, вы пабяжыце ў першую чаргу, а ён будзе вас ратаваць. Таму трэба глыбей разбірацца ў тых дзеяннях, што вакол адбываюцца.

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — Мы жывём у аб'ектыўных умовах адкрытай інфармацыйнай прасторы. Рызыка абумоўлена развіццём інфармацыйных тэхналогій, якія адбіліся на глабальных працэсах. Заходнюю Еўропу захапіла тое, што называецца постмадэрнізмам — філасофскім кірункам са змешваннем жанраў і стыляў. І як гэта адбіваецца на ўсіх, у тым ліку на нас, нашых людзях? Фарміруецца мазаічнае ўспрыняцце рэальнасці, так званае кліпавае мысленне. Гэта падобна на тое, як у вядомай казцы, калі Кашчэй Бессмяротны выставіў адну жывую царэўну і дзевяць яе шкляных копій і прапанаваў Івану Царэвічу разбіць іх. І калі б не муха, якая села на жывую царэўну, то, напэўна, адбылася б трагедыя. Так і ў СМІ: вельмі складана адрозніць сапраўднае ад фальшывага, рэальнае ад віртуальнага.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Згодна з нормамі журналістыкі, у журналіста любой цывілізаванай краіны павінны быць дзве экспертныя крыніцы на пэўную сітуацыю. І, зразумела, яны не павінны быць ананімнымі. На жаль, з-за грэбавання гэтым правілам і ўзнікаюць усе праблемныя сітуацыі. Выклікана гэта тым, што доўгі час інтэрнэт-парталы ў прынцыпе не мелі ніякіх адносін да сродкаў масавай інфармацыі. Сітуацыя змянілася. І зараз яны як мінімум прыроўненыя да іх. Адпаведна на інтэрнэт-парталы таксама распаўсюджваецца закон «Аб СМІ».

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Што тычыцца блогераў, трэба пераходзіць крыху ў іншую плоскасць. Калі расійскі блогер мае вялікую колькасць падпісчыкаў, ён павінен рэгістравацца. І гэта правільна: блогеры ствараюць пэўную грамадскую думку, яны займаюцца распаўсюджваннем інфармацыі для неабмежаванай колькасці чытачоў, карыстальнікаў. Таму яны павінны несці за гэта такую ж адказнасць, як і зарэгістраваныя сродкі масавай інфармацыі.

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — Для класа спажыўцоў на Захадзе будзе толькі інтэрнэт, для эліты і звышэліты — кніга. Незалежна ад таго, у якім варыянце — папяровым ці электронным — яе можна чытаць. Пакуль постмадэрнізм імкнецца поўнасцю ахапіць віртуальную прастору. Але калі ў віртуальнай прасторы будуць працаваць геніі, як Эйзенштэйн, тады можна будзе адшукаць новыя сувязі паміж рэальнасцю і віртуальнасцю з тым, каб гэтая віртуальнасць не выцесніла тое добрае, што засталося ў чалавеку і што, па вялікім рахунку, робіць чалавека чалавекам.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Сёння складваецца сітуацыя, што мы самі павінны сябе абараняць. Мы ведаем, што ёсць блогеры адыёзныя, якія пішуць аб тым, як у нас усё дрэнна. Думаю, кожны з нас іх ведае, у той ці іншай ступені чытае. Калі чалавека ўсё задавальняе, чаму мала станоўчых каментарыяў пад матэрыяламі ў інтэрнэце? Адказ навідавоку: калі ў тваім жыцці ўсё ў парадку, табе больш няма чаго рабіць, як толькі пакідаць пэўныя каментарыі ў інтэрнэце. Як толькі ты пазбавішся месца працы або, на твой погляд, да цябе няправільна прымянілі нормы заканадаўства, адразу ж узнікае жаданне выказацца. Усё выкідваецца ў інтэрнэт — і колькасць негатыўных каментарыяў расце. Ствараецца ўражанне, што такое ж і меркаванне народа аб дзейнасці органаў унутраных спраў. На самай справе ўсё зусім не так. І падстаў не верыць вынікам у тым ліку праведзеных намі апытанняў няма. Гэта і ёсць тыя 20% людзей, якія негатыўна адносяцца да дзейнасці супрацоўнікаў унутраных спраў, выплюхваючы сваю жоўць, у тым ліку карыстаючыся перавагамі ананімнасці.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Яны часцяком і адносяцца да ліку правапарушальнікаў.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — І, як правіла, знайсці сярод іх чалавека, які, умоўна кажучы, жыве і нікога не чапае, але ў той жа час мае адмоўнае меркаванне аб нашай дзейнасці, будзе вельмі складана.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Па нашай просьбе Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь правёў даследаванне. Я ўпэўнены, што калі б яго праводзіла любая іншая сілавая структура, вынікі былі б падобнымі. Людзі ўспрымаюць інфармацыю ад МНС. Успрымаюць праз усе каналы, з якімі мы працуем: сацыяльная рэклама, білборды, сродкі масавай інфармацыі... Не трэба быць экспертам, каб праецыраваць гэтую інфармацыю на ўвесь сілавы блок.

**«Аб'ектыўнасць па вызначэнні не можа быць аператыўнай, а аператыўнасць не можа быць аб'ектыўнай».**

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — Меншых, чым у нас, у Беларусі, крымінальных паказчыкаў няма нідзе ў свеце. Каэфіцыент злачыннасці на тысячу чалавек — 1,62. Напрыклад, у 1994 годзе ён дасягаў 11. У 1993 годзе ў арміі налічвалася каля 100 забітых, 42 самазабойствы. Сённяшняя сітуацыя ў лічбах меншая ў 40 разоў. Летась, напрыклад, ні адзін чалавек не загінуў пры выкананні абавязкаў ваеннай службы. І гэта нягледзячы на тое, што ёсць аб'ектыўная рызыка. Напрыклад, штогод у нас размініруюць да 27 тысяч выбухованебяспечных прадметаў — галоўным чынам тых, якія засталіся пасля Вялікай Айчыннай вайны.

## «ПАПУЛЯРНЫ» НЕГАТЫЎ

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Нам не хапае пэўнай падтрымкі збоку. Быццам бы глабальна яна ёсць. Ніхто не адмаўляецца: ні газета «Звязда», ні іншыя сродкі масавай інфармацыі. Але зноў-такі ў тых жа самых станоўчых матэрыялах ідзе або канстатацыя факта, або падаюцца меркаванні нашых спецыялістаў. Міліцыянер кажа пра тое, што наркотыкі — гэта дрэнна. І тое, што мы павялічылі тэрміны нясення адказнасці за наркотыкі, гаворыць толькі адна міліцыя. Я, шчыра кажучы, іншых меркаванняў не бачыў ужо даўно. Абсалютна зразумелая чалавечая рэакцыя (яна, напэўна, дакладна такая ж у кожнага з нас): калі я кажу, што невінаваты, або калі сам раскажу вам, наколькі я сёння харошы, вы, вядома, мяне выслухаеце, але, калі выйдзеце з памяшкання, абмяркуеце паміж сабой і, адпаведна, меркаванне ў вас будзе асабістае, складзенае з дапамогай пэўных крыніц. Узяць хоць бы апошнюю сітуацыю з мужчынам без месца жыхарства, якога супрацоўнікі міліцыі папрасілі пакінуць пераход. Для нас яна ў большай ступені бясспрэчная. І з пункту гледжання супрацоўнікаў органаў унутраных спраў я нават не магу сказаць, што гэта было пэўнае прымяненне сілы, названае ў некаторых СМІ «збіццём». Але загалоўкі ў асноўным былі менавіта такія: «Супрацоўнікі міліцыі збілі чалавека ў пераходзе».

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — А вось загаловак — «Рэцыдывіста, які стаў бамжом, супрацоўнік міліцыі выгнаў з метро» — наўрад ці выклікаў бы такую рэакцыю. Зразумела, што яркі загаловак зараз у трэндзе. Але гэта перавварочванне сітуацыі. Як аднойчы сказаў міністр унутраных спраў: «Адбывалася ўсё ў рамках закону. Можа быць, трэба было весці сябе менш эмацыянальна». А часам неэмацыянальна паводзіць сябе немагчыма.

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — У новай Ваеннай дактрыне, прынятай у першым чытанні, незалежныя журналісты ўгледзелі, што мы асцерагаемся нейкіх каляровых рэвалюцый і ўнутраных узброеных канфліктаў. Палітычныя або ваенныя тэхналогіі амбівалентныя. Іх веданне самымі шырокімі слаямі насельніцтва не дазваляюць, па меншай меры, засцерагчы сябе. Чаму заклікаюць на майдан? Чаму заклікаюць на плошчу? Бо яшчэ 100 з лішнім гадоў таму было добра вядома аб тым, што ў натоўпе свядомая асоба пераносіцца прыкладна

на 40 тысяч гадоў назад, калі чалавек быў адаптаваны да варварства. Аб гэтым пісаў Фрэйд, Лебон, ёсць кніга французскіх аўтараў «Рэвалюцыйны неўроз», дзе апісваюцца падобныя выпадкі, у тым ліку як падчас Вялікай французскай рэвалюцыі натоўп сустрэў царадворца і не проста яго разарваў, а з'еў зажыва. Таму людзі павінны ведаць, што такое натоўп і чаму ў Беларусі папярэджаны такія дзікія выпадкі. У нас гэтага не будзе, у тым ліку дзякуючы мудрасці беларускага народа.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Насамрэч, калі б у ролі экспертаў у матэрыялах пра МНС не толькі мы расказвалі, якія мы харошыя і якія правільныя дзеянні здзяйсняем, а каб гэта былі канкрэтныя людзі, не ананімы, з фотаздымкамі ў газеце, я думаю, што гэта пазітыўна паўплывала б на сітуацыю.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Наўрад ці хтосьці з разважных людзей можа папракнуць нас у тым, што мы лаяльна ставімся да праваахоўнікаў у сваіх шэрагах. Узяць хоць бы такую сітуацыю, як кіраванне ў нецвярозым стане транспартным сродкам начальнікам аднаго з падраздзяленняў Віцебскага РАУС. Тут сітуацыя адназначная: ён звольнены. Але мы, на жаль, не можам займаць сёння такую пазіцыю ў прадстаўленні афіцыйнай інфармацыі, як інтэрнэт-парталы. Якія сёння крыніцы інфармацыі ў інтэрнэце? Ім даслалі відэа. Што журналісты ўбачылі, тое і распісалі.

**«Наша задача заключаецца ў тым, каб у кожнага грамадзяніна і ў цэлым у грамадстве захоўвалася ўсё-такі правільнае разуменне, што на варце закону, правапарадку і бяспекі краіны стаяць прафесіянальныя, сумленныя, добрапрыстойныя служачыя, ваеннаслужачыя, супрацоўнікі».**

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — І яшчэ дабавілі сваё меркаванне.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Як правіла, яно негатыўнае. Нам для таго, каб абвергнуць або пацвердзіць пэўную інфармацыю, спачатку трэба вывучыць яе. Я не магу, толькі прагледзеўшы ролік, як прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў, выказацца, хто мае рацыю, а хто не. Напрыклад, пад выкладзеным у інтэрнэце відэа, калі мужчына едзе па зялёнай зоне з парушэннем правілаў дарожнага руху, каментарыі наступныя: «ДАІ ловіць веласіпедыстаў замест таго, каб сачыць за парадкам у дварах». Для таго, каб высветліць ісціну, мне спатрэбіўся пэўны час. Як толькі я пракаментаваў сітуацыю ў сацыяльных сетках, інтарэс да навіны знік. Ужо нікому гэта не цікава.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Мы нядаўна сутыкнуліся з такой сітуацыяй, як быццам бы ў беларускім малацэ знойдзены цэзій і стронцый. Я спадзяюся, што кіраўнік фермерскай гаспадаркі, дзе гэтае малако было ўзятае, або кіраўнік прадпрыемства, куды яго даставілі, усё-такі звернецца ў суд, каб гэта прывяло да пэўных юрыдычных наступстваў, паколькі ўрон іміджу, рэпутацыі сродкамі масавай інфармацыі нанесены значны. Яшчэ адзін з апошніх прыкладаў. Чатыры журналісты (я іх усіх ведаю пайменна) вырашылі, што цяпер нельга запальваць у рэстаране свечку. Такіх людзей роўна чатыры, але, на жаль, яны справакавалі дастаткова сур'ёзную інфармацыйную хвалю. Не праверыўшы, не ўдакладніўшы, не задаўшы дадатковых пытанняў. Гэта прыклад, калі журналіст прыняў рашэнне, што інфармацыя, якую ён успрыняў, дакладная, і распаўсюдзіў яе.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — У той жа час пераўтвараць сайты сілавых структур, у прыватнасці МУС, у крыніцу абвяржэння чутак таксама няправільна і некарэктна. Ініцыятыўна да мяне па каментарыі ніхто не звяртаецца. Тэлефануюць у «Звязду» або іншы дзяржаўны СМІ і просяць абвергнуць тую ці іншую інфармацыю, змешчаную на нейкім партале або дзесьці яшчэ, — таксама не падыход. У той жа час, як толькі мы размяшчаем інфармацыю аб геройскіх учынках супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў, яна нікога, акрамя дзяржаўных СМІ, не цікавіць. Народ гэта не хвалюе. Ім бы пачарней ды больш жорстка.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Народ гэта не хвалюе, бо ён лічыць, што так павінна быць. Што міліцыянер кінецца ратаваць жанчыну ў мора, што супрацоўнік МНС павінен увайсці ў палаючы дом — маўляў, гэта іх работа.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Пад матэрыялам, у якім распавядаецца пра канфіскацыю вялікай колькасці зброі і элементаў выбуховых прыстасаванняў у аднаго чалавека, усяго 39 каментарыяў. У той час як па сітуацыі ў пераходзе — каля 700. І ўсе, каму толькі хочацца, абмяркоўваюць, правільна зрабіў той міліцыянер ці не. Ну давайце будзем абмяркоўваць токараў: правільна яны пілуюць тыя балванкі або няправільна. І ў выніку мы маем, што прыкладна кожны дзень у СМІ з'яўляецца адзін негатыўны факт аб дзейнасці МУС — прыкладна 300 у год. У той жа час штогод у сродках масавай інфармацыі выходзіць каля 140 тысяч станоўчых матэрыялаў аб органах унутраных спраў. Гэта матэрыялы абсалютна рознага ўзроўню. Пачынаючы ад згадвання ролі органаў унутраных спраў на пэўных пасяджэннях выканкамаў, заканчваючы мэтанакіраванымі нарысамі, спецыяльнымі газетнымі палосамі (як гэта ёсць у «Звяздзе»), тэматычнымі разваротамі і гэтак далей. Тым не менш народ «клюе» на негатыў.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Сапраўды, калі на сайце МНС размешчаны дзве навіны — адна пра загінулага чалавека, а другая пра выратаванага — нескладана здагадацца, якая навіна разыдзецца па ўсіх сродках масавай інфармацыі. Больш за тое, раней я імкнуўся (цяпер перастаў гэта рабіць) угаварваць журналістаў узяць тую ці іншую пазітыўную навіну пра нас. Адкрытым тэкстам я атрымліваў адказ, што гэты загаловак не выкліча цікавасці, на гэтую навіну не будуць клікаць, яе не будуць каментаваць.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Трэба задумацца, чаму пры ўсім аб'ёме інфармацыі, якая з улікам інтэрнэту сёння даступная для любога карыстальніка, ён выбірае менавіта негатыўную інфармацыю. І, на жаль, гэта ўсё-такі пытанне не наша. У нас у любым выпадку ніколі (і гэтаму мяне вучылі з першага дня працы ў прэс-службе) не будзе загалоўкаў, якія крычаць. Ніколі не будзе ў нашых матэрыялах і сенсацыйнасці. Якім бы жорсткім не было злачынства.

## ВЫХАВАННЕ ВЫХАВАЦЕЛЯЎ

**Віталь НАВІЦКІ:** — Журналіст абавязаны правяраць дакладнасць атрыманых звестак. І адпаведна, пакуль ты не правядзеш гэтую праверку, выдаць матэрыял ты не можаш. Пры гэтым звярніце ўвагу на любыя сенсацыйныя, скандальныя расследаванні. Журналісту нельга выказваць сваё меркаванне. Ён павінен даць экспертнае, а не ананімнае меркаванне розных бакоў і прадставіць чытачу магчымасць самому зрабіць выснову. На жаль, у пагоні за клікамі, за наведвальнікамі выснова даецца адразу ў загалоўку. У большасці людзей, якія нават не клікнуць на навіну, ужо па загалоўку сфарміруецца меркаванне і ўспрыняцце рэчаіснасці. Для паважанага партала, які наведваюць кожны дзень, гэтага дастаткова. І нават калі ўнутры гэтай заметкі будзе каментарый ад прадстаўніка той структуры, якую абвінавачваюць у якіх-небудзь няправільных дзеяннях, для чалавека, які прайшоўся па загалоўках, гэта ўжо не мае значэння. Ён ужо зрабіў вывад і прыняў для сябе рашэнне, хто вінаваты, а хто не.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Нашы некаторыя грамадзяне, аматары папіярыцца на пэўных гарачых тэмах не задумваюцца аб аб'ектыўнасці. Яны даюць аператыўна тое, што ў іх ёсць у галаве. Выкладваючы сваё меркаванне ў сваім акаўнце, жывым часопісе і нават на сайце, яны ніколі не будуць разбірацца, аб'ектыўна гэта ці не.

**Віталь НАВІЦКІ:** — Праблема зводзіцца да журналіста, рэдактара, кіраўніка гэтага журналіста, які павінен спыняць неправераную інфармацыю і на шкоду аператыўнасці прымаць рашэнне не публікаваць яе. Але ці будуць яны гэта рабіць, калі ад колькасці клікаў, пераходаў залежаць тыя грошы, якія можна папрасіць у рэкламадаўцаў? У той час мы бачым сусветныя прыклады, калі буйнейшыя выданні ЗША, Еўропы працуюць па гэтых прынцыпах. Я спадзяюся, што раней ці пазней такія прынцыпы будуць распаўсюджвацца і на нашыя інтэрнэт-СМІ.

**Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ:** — Аб'ектыўнасць па вызначэнні не можа быць аператыўнай, а аператыўнасць не можа быць аб'ектыўнай. Самая аператыўная інфармацыя па лініі МУС — гэта тыя факты здзейсненых за суткі злачынстваў, якія мы выкладаем на свой сайт са зводкі Міністэрства ўнутраных спраў. Я магу гэтай інфармацыі не даваць з-за адсутнасці пэўных дэталяў. Але ці будзе гэта аператыўна? Мы ніколі не ўказваем прозвішчы людзей. Даём пасыл, каб у журналіста была нагода пачаць свой працоўны дзень.

**Сяргей КАБАКОВІЧ:** — Добра, калі сітуацыя адназначная. Тады мы можам нешта каментаваць. І тое трэба разбірацца. У той сітуацыі, калі з акна на Каменнай Горцы выпала дзіця, разышлася інфармацыя, што бабуля была на кухні. Хто сказаў, што яна там была? І па форумах разышлося, што бабуля вінаватая, не дагледзела. Нам важны сам факт падзення. Мы павінны правесці праверку і дамагчыся ісціны, якая дазволіць расставіць усе акцэнты па сваіх месцах. А некаторую прэсу ў першую чаргу цікавіць адразу ж, хто вінаваты.

**Уладзімір МАКАРАЎ:** — Да нашай размовы прыбліжана такая праблема, як фарміраванне чалавека, грамадзяніна, патрыёта Рэспублікі Беларусь. Звычайна гэтую тэму зводзяць да выхавання моладзі. Але галоўная праблема ў іншым. Размова ідзе аб выхаванні выхавацеляў. Калі ў дачыненні да арміі, 200 гадоў таму гэта было сказана, рэалізавана галоўным чынам у XX і ў XXI стагоддзях на практыцы. Першапачаткова Клаўзевіцам. Тое, што будучыя войны могуць быць паспяховымі для дзяржавы, дзе забяспечаны трыадзіная сувязь улады, народа і арміі, — гэта не праславутыя лозунгі, а арганічная сувязь паміж імі.

**«На экспертным полі з'явіўся новы гулец, якога можна назваць ананімным экспертам. На жаль, з гэтым ананімным экспертам нам усім даводзіцца ледзь не на роўных мець зносіны».**

**Віталь НАВІЦКІ:** — Да таго часу, пакуль стандарты журналістыкі не будуць выкарыстоўвацца ў поўнай меры так, як яны цяпер выкарыстоўваюцца газетай «Звязда», «Советской Белоруссией», Белтэлерадыёкампаніяй і іншымі дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі, да той пары, пакуль яны не распаўсюдзяцца на прыроджаныя да СМІ інтэрнэт-сайты, сітуацыя будзе мяняцца складана. Я бачу пазітыўныя змены. Журналісты інтэрнэт-СМІ ўжо хоць бы звяртаюцца па інфармацыю. Адна справа, што не заўсёды гэтую інфармацыю можна даць у аператыўным рэжыме. Але да той пары, пакуль не будзе, як у галівудскіх серыялах, калі ў журналіста ёсць суперэксклюзіўнае відэа пэўнага здарэння, сітуацыі або крымінальнага скандалу, пакуль ён не атрымае пацвярджэнне з іншай крыніцы, то не выдасць гэтае відэа. На жаль, сёння для нас гэтая сітуацыя як карцінка з кінастужкі, і мы добра разумеем, што любое відэа без разбору — змантавана яно ці не, адпавядае рэчаіснасці ці не — абавязкова будзе выстаўлена: і як можна раней, і як можна з больш яркім загалоўкам.

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by

# ЯКІМІ РАТАЎНІКОЎ БАЧАЦЬ ДЗЕЦІ?

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## У БЕЛАРУСІ ЗАВЯРШЫЎСЯ ТВОРЧЫ КОНКУРС СЯРОД ШКОЛЬНІКАЎ

**Творчы рэспубліканскі агляд-конкурс «Ратаўнікі вачыма дзяцей» прайшоў у Беларусі ў васямнаццаты раз. Школьнікі імкнуліся творча пераасэнсаваць не толькі прычыны ўзнікнення пажараў, але і тэму ратавання людзей, якія трапілі ў бяду з-за надзвычайных сітуацый.**



Пляцоўка Мінскага палаца дзяцей і моладзі ператварылася ў выставачную галерэю. Сцены і вітрыны ўпрыгожылі вырабы і агітацыйныя плакаты, мадэлі пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі, малюнкі і скульптуры. Тым жа, каму больш даспадобы літаратурнае слова, арганізатары конкурсу прапанавалі паўдзельнічаць у іншых намінацыях — стварыць казку, верш і апавяданне. Сабраліся толькі самыя лепшыя — тыя, хто прайшоў адбор на школьным, раённым, а затым абласным (гарадскім для Мінска) этапах.

Вылучаліся работы з рэгіёнаў Беларусі — напрыклад, і ратаўнікам, і наведвальнікам вельмі спадабаўся «Верталёт-выратавальнік». Мадэль зроблена з гліны, што для лятаючага апарата, пагадзіцеся, незвычайна. Зляпілі яго вучні Альгоўскай школы Віцебскага раёна Іван Танкавід, Канстанцін Бякешчанка і Вольга Гіранкова.

Таксама часта спыняліся ля малюнка з простай формулай — «Дзеці + запалкі = бяда». Гэта напамін пра небяспеку гульні з агнём стварыў трынаццацігадовы Ягор Кулік з вёскі Правыя Масты Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Прыцягваў увагу і выраб Алега Карпача з вёскі Карпацэвічы Нясвіжскага раёна. «Ва ўсе часы наша служба і небяспечная, і цяжкая» — падпісана інсталяцыя з вусатым пажарным.

Дзеці з цікавасцю аглядалі работы, зробленыя з разнастайных матэрыялаў — паперы, металу, пластыку, гліны... Увагу многіх людзей прыцягнула дзеючая мадэль самалёта, якую зрабілі ўдзельнікі конкурсу з Гомеля. Хоць ён і лётае толькі па коле, але затое з дапамогай спецыяльных тумблераў можна кіраваць рухавіком.

Спецыялісты кожны раз адзначаюць высокі мастацкі ўзровень выканання работ, іх разнастайнасць, уражальнае багацце дзіцячай фантазіі і творчы падыход. Важна і тое, што ў конкурсе ўдзельнічаюць з самага юнага ўзросту. Самы малодшы ўдзельнік гэтага года і спецыяльны прызёр — сямігадовы Антон Носік з плакатам-аплікацыяй на тэму бяспекі.

А ў сталічным Палацы дзяцей і моладзі на ўрачыстай цырымоніі падвядзення вынікаў конкурсу ўсе пераможцы і прызёры атрымалі з рук кіраўнікоў ратавальнага ведамства і арганізатараў конкурсу заслужаныя прызы і падарункі. Усяго было адзначана 70 фіналістаў.

Арганізатарамі конкурсу па традыцыі сталі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства адукацыі, Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя ратаўнікоў-пажарных, Добраахвотнае пажарнае таварыства, Таварыства ратавання на водах і аб'яднаная рэдакцыя часопісаў «Служба выратавання» і «Юны ратаўнік». Конкурс адбыўся пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ).

**Павел ГОРБАЧ.**

# ЗБІРАЕЦЦА РАЗАМ ЛІТАРАТУРНАЯ МОЛАДЗЬ

**У «Сілічах», што пад Мінскам, заўтра пачынае сваю працу Літаратурны фестываль моладзі Расіі, Украіны, Беларусі**

У праграме шматдзённага творчага праекта — майстар-класы, «круглыя сталы», сустрэчы з пісьменнікамі старэйшага пакалення. Заснаваў літаратурны фестываль Фонд сацыяльна-эканамічных і інтэлектуальных праграм пры падтрымцы «Раструку» і актыўным удзеле «тоўстых» расійскіх літаратурна-мастацкіх часопісаў і ўкраінскага часопіса «Радуга». У беларускім гарналыжным цэнтры сваімі поглядамі на сучасную літаратуру падзеляцца празаік Андрэй Дзмітрыеў, крытык і публіцыст Аляксандр Казінцаў, празаік і крытык Раман Сенчын. «Круглы стол» на тэму «Пра літаратуру ў постсавецкі перыяд» правядзе прэзідэнт Фонду сацыяльна-эканамічных і інтэлектуальных праграм, старшыня Саюза пісьменнікаў Масквы Сяргей Філатаў. Паэтычны вечар удзельнікаў семінара пазнаёміць з творчасцю паэтаў Беларусі — Маргарыты Латышкевіч, Дар'і Лосевай, Рагнеды Малахоўскага, Кацярыны Масэ; Расіі — Дзіны Курскай, Клемянціны Шыршовай; Украіны — Івана Валасюка, Кацярыны Дзерышавай, Паўла Пахоменкі ды іншых цікавых аўтараў, якія ўжо актыўна друкуюцца ў сваіх краінах, творчасць якіх вядомая праз інтэрнэт-прастору. А галоўны рэдактар часопіса «Иностранная литература» Аляксандр Ліверганта правядзе сустрэчу на тэму «Крытэрыі адэкватнасці перакладу мастацкага тэксту».

Фестываль выйдзе і за межы «Сіліч» Лагойскага краю. Адбудзецца сустрэча з яго ўдзельнікамі ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. А таксама маладыя творцы і кіраўнікі майстар-класаў выступяць у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Прэзентацыя

# НЯСТОМНЫ ВАНДРОЎНІК ЯНКА МАЎР

## Дзве новыя кнігі — у вянок памяці пра вядомага пісьменніка




Фота Кастуся ДРОБАВА

Яго называлі «бацькам беларускай дзіцячай літаратуры» і «капітанам дзіцячых падарожжаў». Яго кнігамі захапляліся Купала з жонкай, іх перакладчыкамі на замежныя мовы часта выступалі самыя простыя чытачы, уражаныя талентам творцы. Ён умеў настолькі пераканаўча напісаць пра вандроўкі і прыгоды, што не ўзнікала сумневаў: аўтар там быў і ўсё бачыў на свае вочы.

Вядомага беларускага пісьменніка Янку Маўра сёння часта ўспрымаюць перш за ўсё як аўтара кніг для дзяцей і падлеткаў, але ж ён пісаў і кнігі для дарослых, быў таленавітым гісторыкам і географам, валодаў міжнароднай мовай эсперанта.

Дзень нараджэння творцы стаў выдатнай нагодай прэзентаваць у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі дзве новыя кнігі; яны пабачылі свет акурат сёлета і раскрываюць розныя бакі жыцця і творчасці, прыадчыняюць раней не вядомыя старонкі лёсу Янкі Маўра. Так, у Выдавецкім доме «Звязда» асобнай кнігай выйшлі ўспаміны дачкі пісьменніка Наталлі Міцкевіч «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа» (колькі гадоў таму яны друкаваліся ў часопісе «Полымя»), а Выдавецкі дом «Беларуская навука» прадставіў кнігу выбраных твораў Маўра. Адметна, што яе укладальніцай стала ўнучка творцы Марыя Міцкевіч, а прадмову напісала яго праўнучка Васіліна.

### УРОКІ ВЫХАВАННЯ

Два класікі беларускай літаратуры Янка Маўр і Якуб Колас сябравалі амаль усё жыццё. Яны пазнаёміліся на нелегальным настаўніцкім з'ездзе ў Мікалаеўшчыне ў 1906 годзе, ліставаліся ў гады вайны, а ў 1946 годзе нават сталі сваякамі: малодшы сын Коласа Міхась ажаніўся з малодшай дачкой Маўра Наталляй. Таму назва для ўспамінаў Наталлі Міцкевіч «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа» гучыць досыць сімвалічна. Але ініцыятарам напісання гэтай кнігі выступіў Міхась Міцкевіч. Ён расказвае:

— Наталля вельмі часта дзялілася ўспамінамі пра свайго бацьку, жыццё іх сям'і. Я ж прапанаваў ёй занатаваць гэтыя гісторыі, ведаючы, што пра Маўра не напісана грунтоўнай кнігі сямейных успамінаў. Адразу ж прыдумаў назву. І жонка пагадзілася, пачала працу. Наталля скончыла Маскоўскі авіяцыйны інстытут, абараніла дысертацыю, таму ў яе расповеду выдатная логіка. Праўда, ва ўспамінах Наталлі мне крыху не хапала гумару. Таму, каб кніга была цікавейшай, лягчэйшай, давялося дадаваць некаторыя смешныя выпадкі. Жонка спачатку была супраць такіх «правак», але потым пагадзілася. Так здараецца: некаторыя памятаюць усё цяжкае, што перажывалі, іншыя стараюцца пакінуць ва ўспамінах толькі смешныя гісторыі. У жыцці сям'і Маўра былі розныя старонкі — сумныя і вясёлыя.

З кнігі ўспамінаў Наталлі Міцкевіч можна даведацца шмат новага пра сям'ю Івана Фёдарава (такое сапраўднае прозвішча пісьменніка), яго жыццёвы лёс. Пасля ўдзелу ў нелегальным настаўніцкім з'ездзе настаўніку і будучаму літаратару было забаронена працаваць у школе, таму некаторы час ён на сваім ровары проста вандраваў па беларускіх дарогах. Так завітаў да айца Уладзіміра ў вёску Верхмень, дзе ў той час працаваў Колас. Праўда, тады творцы не сустрэліся. Але айцец Уладзімір парэкамендаваў Івану Фёдараву паехаць у мястэчка Турэц, бо дачцэ айца Фёдара Варвары патрэбен быў хатні настаўнік для дзяцей. Неўзабаве муж Варвары памёр, і яна паставіла Маўру ўмову: або шукаць новую працу, або ажаніцца з ёй, бо маладому мужчыну жыць у адным доме з незамужняй жанчынай, хай сабе і старэйшай за яго ўдавой, лічылася недапушчальным. Ён палюбіў дзяцей, асабліва малодшага — Мішу, таму і прыняў рашэнне ажаніцца з Варварай.

Яны абвянчаліся ў 1909 годзе, а праз два гады ў сям'і нарадзіўся сын Фёдар. Праз пяць гадоў Маўр стаў бацькам яшчэ аднаго сына — Арсеня, а ў 1919 годзе з'явілася на свет яго дачка Аляксандра. На жаль, у гэтым жа годзе Варвара цяжка захварэла і памерла. Праз год пісьменнік ажаніўся са Стэфанідай Шылёнак, жанчына стала добрай маці для дзяцей Маўра, а ў 1924 годзе нарадзіла дачку Наталлю.

Пісьменнік меў вялікі вопыт выхавання дзяцей, разумеў іх псіхалогію і быў выдатным бацькам.

**Янка Брыль расказваў такую показку. Маладыя пісьменнікі запыталіся ў Маўра, як яму пішацца. Ён адказаў: «Раней напішу старонку, так і пакіну. А цяпер напішу — і палову закрэсліваю».**

— У кнізе шмат звестак пра тое, як Маўр ставіўся да сваіх дзяцей, якіх прынцыпаў прытрымліваўся ў іх выхаванні, — кажа Міхась Міцкевіч. — Ён ніколі не ўзвышаў голас, не сварыўся. Была такая гісторыя. Старэйшы сын Фёдар, калі быў хлопчыкам, аднойчы «адбіўся ад рук» і замест урокаў усё часцей гуляў з сябрамі. Бацька бачыў, што хлопец здольны, і вырашыў даць яму ўрок. Сабраў усе рэчы хлопца ў торбачку і сказаў: калі не хочаш займацца, ідзі сам сабе здабывай хлеб, але калі адумаешся, вырашыш старанна вучыцца, то ў любы час вяртайся. Той выйшаў з хаты, пахадзіў некалькі гадзін і вярнуўся ў хату. І ўрок пайшоў на карысць. Фёдар стаў вядомым фізікам-тэарэтыкам, абараніў доктарскую дысертацыю. А самай малодшай дачцэ Наталлі бацька заўсёды казаў так: калі бачыш, што рэч ляжыць не на сваім месцы, абавязкова прыберы, папраў, каб усё было ў парадку.

Дарэчы, вельмі цікавым спосабам Маўр заахвочваў дачку чытаць. За пэўную колькасць прачытаных старонак абяцаў даць грошы на марожанае ці іншыя прысмакі. І гэта спрацавала. Наталля вельмі палюбіла чытаць, сабрала вялікую бібліятэку і сваіх дзяцей навучыла цаніць багацце кнігі.



### НАРАДЖЭННЕ І ЖЫЦЦЁ МАЎРА

Імя «Янка Маўр» гучыць сапраўды незвычайна і прыцягвае ўвагу чытача. Неабходнасць у творчым псеўданіме ўзнікла адразу, калі малады чалавек пачаў пісаць. А справа ў тым, што ён — поўны цёзка рускага першадрукара Івана Фёдарава. Знайсці ж гучнае імя пісьменніку дапамагла знакамітая фраза з Шылера: «Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа ісці».

Калі кніга ўспамінаў Наталлі Міцкевіч расказвае гісторыі з асабістага жыцця Янкі Маўра, то зборнік выбраных твораў пісьменніка з серыі «Беларускі кнігазбор» паказвае як вядомыя, так і зусім нечаканыя старонкі яго творчасці. Укладальніца выдання і ўнучка Маўра Марыя Міцкевіч расказала:

— Пра этапы станаўлення асобы Янкі Маўра можна даведацца з яго аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры», яна ўвайшла ў кнігу выбранага. Гэты выдатны твор распавядае пра дзяцінства будучага пісьменніка, яго вучобу ў Коўне і Паняважы. Пранікнёныя старонкі ён прысвяціў сваёй маці, якая выратавала яго жыццё. Маленькага Янку неяк пакусаў шалёны сабака, ён хварэў на воспу, але застаўся жыць. Маці таксама старалася, каб ён атрымаў адукацыю. Падчас вучобы ў Коўне ў рамеснай вучэльні хлопец захапіўся чытаннем, асабліва прыгодніцкай літаратуры, марыў праехаць па ўсіх гарах і рэках свету.

Пачаткам літаратурнай дзейнасці творцы можна лічыць 1923 год, калі з'явіліся яго першыя публікацыі ў газеце «Савецкая Беларусь» і ў петраградскім часопісе сатыры і гумару «Бегемот». Свой першы вялікі і сур'ёзны твор Маўр напісаў 90 гадоў таму. Гэта аповесць «Чалавек ідзе», якая друкавалася ў 1926-1927 гадах у некалькіх нумарах часопіса «Беларускі піянер», а асобным выданнем пабачыла свет у 1927 і 1933 гадах. Твор «Чалавек ідзе» быў прыхільна прыняты чытачамі. І ў хуткім часе Цішка Гартны, які ў той час быў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, прапанаваў пісьменніку напісаць новую кнігу. Так з'явілася першая прыгодніцкая аповесць «У краіне райскай птушкі». А потым з-пад Маўравага пяра выйшаў твор, які сёння назвалі б бестселерам. Гэта, вядома ж, «Палескія рабінзоны» — адна з самых любімых кніг многіх пакаленняў школьнікаў.

— Магчыма, сакрэт поспеху гэтай аповесці ў тым, што яна паказвае: цікавымі могуць быць не толькі замежныя краіны, але і ў Беларусі шмат адметнага, — разважае Марыя Міхайлаўна. — Папулярнасць кнігі была проста неверагодная, яна перавыдавалася некалькі разоў, перакладалася на розныя мовы, нават кітайскую, але, на жаль, па-руску аповесць так і не выйшла.

Янка Маўр лічыцца і пачынальнікам жанру фантастыкі ў беларускай літаратуры. Яго фантастычную аповесць «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» таксама можна пачытаць у новай кнізе выбранага. Ёсць у выданні артыкулы пісьменніка, якія раней не публікаваліся. Марыя Міцкевіч адзначае:

— Дзядуля меў план напісаць вялікую гістарычную кнігу пра паходы крыжакоў на беларускія землі. Але, на жаль, задума не здзейснілася. Некаторыя часткі «Старонак гісторыі» усё ж захаваліся і ўпершыню надрукаваныя ў гэтым выданні. «Дзіцячы пісьменнік і дзіцячы чытач» — яшчэ адзін цікавы артыкул Маўра, які раскрывае яго стаўленне да дзіцячай літаратуры. Пісьменнік лічыў, што дзіцячае чытанне — справа вельмі сур'ёзная, што дзяцей ні ў якім разе нельга падманваць. Дзядуля трымаў сувязь з чытачамі, прапаноўваў новыя формы працы. Напрыклад, пісаў артыкулы ў перыёдыку, дзе наўмысна дапускаў памылкі. Дзеці павінны былі іх уважліва прачытаць, правесці міні-даследаванне і выправіць недакладнасці.

Вельмі цікавы артыкул Маўра «Эсперанта». Дарэчы, гэтая міжнародная мова дапамагла пісьменніку стварыць такі вядомы раман, як «Амок». Творца чытаў замежныя эсперанцкія газеты, ліставаўся з сябрамі-эсперантыстамі з розных краін і атрымліваў ад іх рэдкія матэрыялы, лісты, часопісы са здымкамі. Унучка пісьменніка кажа:

— Маўр пазнаёміўся з мовай эсперанта ў 1904 годзе, калі яшчэ вучыўся ў Паняважы, потым актыўна развіваў цікавасць да гэтай мовы ў Беларусі, нават выкладаў на радыёкурсах, у 1926 годзе ўдзельнічаў у міжнароднай канферэнцыі эсперантыстаў, быў ганаровым старшынёй арганізацыі беларускіх эсперантыстаў. Тады эсперанта было вельмі папулярным.

У кнігу ўвайшлі таксама лісты Янкі Маўра да Алеся Якімовіча, Паўла Кабзарэўскага, Анатоля Тонкеля. Асабліва ўражваюць лісты да яго блізкага сябра Якуба Коласа, напісаныя ў эвакуацыі. У ваенныя гады сям'я Коласа апынулася ў Ташкенце, а Маўр з роднымі трапілі ў Алма-Ату. Яны ўвесь час ліставаліся, абменьваліся кнігамі, гэта была неабходная падтрымка, сувязь у вельмі складаныя часы.



Якуб КОЛАС і Янка МАЎР з агульным унукам Сяргеем.

У дадатку да кнігі — вершы-прысвячэнні, артыкулы-ўспаміны пра Маўра, якія напісалі яго дачка Наталля, пісьменнік Сяргей Грахоўскі, яго вучань і сябар Сяргей Міронаў, аўтар кнігі «Дзед Маўр».

Янка Маўр умеў апісваць падзеі ў далёкіх, экзатычных краінах, ствараў фантастычныя сюжэты, прыдумваў неверагодныя гісторыі. Але ж і сам Янка Маўр, яго творы, кажучы словамі Кузьмы Чорнага, — гэта цэлы свет, які нам, чытачам, патрэбна доўга-доўга даследаваць.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Выстава

# АКЦЭНТ НА НЕЗАЎВАЖАНЫМ



Цёплы вечар.

**Ад канцэптуальнага мастацтва, якога апошнім часам шмат на мінскіх выставачных пляцоўках, эксперыментаў і новых форм час перайсці ў гістарычную частку сталіцы, завітаць у Арт-гасцёўню з рэтра-назвай «Высокае мѣста» і звярнуць увагу на тое, як сучасныя аўтары працуюць з традыцыйнымі жанрамі. Новая персанальная выстаўка «Маімі вачыма», што адкрылася 12 мая, змяшчае каля ста работ маладога беларускага мастака, аматара пленэраў Уладзіслава Пятручыка. Асноўная частка і экспазіцыі, і творчасці — пейзаж. Вельмі нам знаёмы.**

Слова «пейзаж» варта разгарнуць і ўдакладніць: карціны з экспазіцыі выглядаюць як адбітыя чалавечым вокам планы звычайнага беларускага асяроддзя, якія мы не прызвычаіліся заўважаць. Беларускае, знаёмае і тыповае тут угадваецца імгненна — залатыя шары каля знаёмага плота, нетрывалыя, хісткія вясковыя агароджы, драўляныя домікі, гаспадарчыя пабудовы, конь у двары, ураджай часнаку, стагі сена — выхапленыя з агляду замалёўкі, выведзеныя са штодзённасці ў ранг прыгажосці.

Работы Уладзіслава Пятручыка, які атрымаў адукацыю ў Глыбокім і Акадэміі мастацтваў Беларусі, ужо знаходзяцца ў калекцыях Германіі, Аўстрыі, Галандыі, Расіі — маладосць захоплівае свет, заўважана. Традыцыйная тэма і рэалізм кладуцца ў мастака на новыя рашэнні жывапісу, і звычайнасць атрымлівае новае прачытанне.

Сцежкі і кветкі, якія вызываюць канкрэтныя асацыяцыі, перамяжоўваюцца з непрывязанымі да ўспамінаў вобразамі, але ўсё адно тыповымі ў тым сэнсе, што прыгажосць дзіўным чынам знаходзіцца ўсюды.

Выстава працягнецца да 29 мая.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Прэм'ера

# КАРЦІНЫ АЛЕЕМ: ХУТКА, ПРАФЕСІЙНА, ГАРАНТЫЯ АЎТАРА

## ПАД НАГЛЯДАМ МАГНЕТЫЧНАГА ПОЗІРКУ З ПАРТРЭТА



Стаць паспяховым мастаком не проста, але магчыма, калі пашанцуе з натхняльнікамі. Загадкавы дэман з выпадковага партрэта можа змяніць лёс творцы.

Модны мастак Чарткоў адмовіўся ехаць вучыцца ў Італію. Адмовіўся, нават нягледзячы на тое, што настаўнік з акадэміі, шаноўны прафесар зрабіў усё, каб уратаваць свайго вучня, — дамовіўся, што менавіта таго адправяць на навучанне за мяжу. Але якое навучанне, і чаму там могуць навучыць ці не самага паспяховага мастака ў горадзе, а то і... Ён сам усіх можа павучыць, варта толькі паглядзець, хто як жыве: у шыкоўных апартаментах — Чарткоў, астатнія ціха зайздросцяць.

Пра поспех у мастацтве і тое, што за ім можа стаяць, разважалі ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, дзе з'явіўся спектакль паводле містычнай аповесці Мікалая Гогаля «Партрэт». Дзеянне адбываецца ў Пецярбургу ў XIX стагоддзі. Але ж для творчых асоб адны спакусы — што тады, што сёння. Таму гогалеўскі «Партрэт» яшчэ жывы.

Ажывае ён на сцэне. Відаць, аўтары задумы ўяўлялі, як гэта можа зрабіць у тэатры, пры гэтым захаваўшы ідэю Гогаля, толькі пакінулі права на свой погляд: жанр пастаноўкі вызначаны як трагіфарс. Аўтар інсцэніроўкі Святлана Навуменка прадугледжвала размову пра псіхалогію творцы, які цярпеў галечу, пакуль містычным чынам на яго не сышло адкрыццё, як усё можна павярнуць. Нібыта пад уздзеяннем дэманічнага погляду чужынца з партрэта ён здрадзіў мастацтву і вышэй за ўсё паставіў свае чыста чалавечыя жаданні: славу і багацце.

Усё ў яго склалася як мае быць: ад заказаў няма адбою, але зробленыя вялікія грошы ён з нейкай прычыны траціць на тое, каб знаходзіць і набываць творы вялікіх мастакоў. Захапляецца ці зайздросціць? Адказ даецца цягам спектакля. Зрэшты, адказ вядомы яшчэ са школы, таму асаблівай інтрыгі няма (хіба што хтосьці захоча прыгадаць твор ці засумаваў па гогалеўшчыне). Таму найбольш цікавіла тое, як задума будзе ўвасоблена на сцэне.

Рэжысёр Аляксандр Гарцуеў, які ў выніку стаў пастаноўшчыкам спектакля, імкнуўся ўзмацніць драматычную гісторыю псіхалагізмам. У Гарцуева ёсць для гэтага свой фірмовы стыль: напружаная музыка — лічы, асобны герой у яго спектаклях. Таксама як і пластычныя сцэны, што даюць магчымасць крыху абстрагавацца ад часу, які адлюстраваны ў Гогаля (дэфіле і танцы дзяўчат у доўгіх сукенках па-за патрабаваннямі моды). Псіхіка героя — таямнічая бездань, з якой паўстае ці чалавек, ці пачварная істота чалавечага выгляду. Таму асноўны псіхалагізм ствараюць акцёры, яны іграюць у спектаклі Гарцуева, як кажуць, «на нерве».



Напружання хапае. Нягледзячы на тое, што гледачу адразу даюць зразумець: перад ім разыгрываюць гісторыю. Яе расказвае чалавек у чорным (акцёр Мікалай Стонька). Аднак нешта больш чорнае (і таямнічае) інтрыгуе ад самага пачатку — партрэт у пампезнай раме ў цэнтры сцэны. Ён ёсць. І паступова ажывае. Літаральна: з яго выходзіць магутны маўклівы велікан (такім здаецца артыст Андрэй Дабравольскі)... А-а-а, рэальны дэман! Мастак Чарткоў перад ім, што авечка, якую вядзі ў любы бок.

Напачатку так і не скажаш: наадварот падатлівым свайму гаспадару падаецца дзяншчык Мікіта. Артыст Сяргей Шымко адлюстраваў яго вельмі арганічна: просты чалавек, сваё месца ведае, шмат не патрабуе, абы было што паесці. І ад сваёй жыццёвай лініі не адыходзіць. На кантрасце з Чартковым.

Роля мастака Чарткова цэнтральная, калі не сказаць больш. Яна і ёсць усё ў гэтым спектаклі. Гэта яго галоўны герой. Гэта яго інтрыга. Яго сэнс. Метафара. У мастацкім афармленні імкнуліся не перабольшыць і не зменшыць нагрузку на гэты вобраз (сцэнаграфія Юрыя Саламонава, над касцюмамі працавала Марына Алёкіна, відэаэфекты Лізаветы Пінігінай, але ад мастака па святле Сямёна Давыдзенкі асабліва залежала містычная атмасфера). Вось вы бачыце, што з чалавекам адбываецца нешта жудаснае: артыст Андрэй Новік быў пераканаўчы. Вось герой апантаны ідэяй. Вось ад зайздрасці ніякавее... Губляе сябе. Губляецца ў сваім шляху. Знаходзіць новы і перараджаецца?

Шчыра кажучы, цяжка паверыць, што істота са скрыўленай свядомасцю, якая таемна знішчае вялікія творы мастацтва, можа ператварыцца ў анёла. Хіба што ў іншым жыцці...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Уік-энд

# ГОРАД ЗАСЫНАЕ, ПРАЧЫНАЮЦЦА МУЗЕІ

## У адну ноч тысячы чалавек стануць удзельнікамі адной «мафіі»

**Чэргі на акцыю «Ноч музеяў» у Мінску ўспамінаюцца з гонарам. Такія ініцыятывы набліжаюць да грамадства высокую, «акадэмічную» культуру. Стэрэатып пра нуднасць у вялікіх залах пад акампанемент настойлівага «таварышы, цішэй» паспяхова разбураецца. Музейная справа здолела не проста зацікавіць шырокія масы, але і стварыць моду на свае мерапрыемствы. Асноўная частка «начэй» пройдзе 21 мая — у нашай краіне ўжо дванаццаты раз (увогуле першая акцыя была арганізавана ў Берліне ў 1997 годзе). Гарады ў гэтую ноч ажывяцца, па вуліцах засноўдаюць вялікія кампаніі, у музеях будзе шумна. Праўда, «ноч» у гэтым выпадку — перабольшванне: асноўная частка пляцовак разлічвае свае праграмы да дванаццаці гадзін. Але гуляць да раніцы, як у песні Цоя, нішто не замінае. Няхай у вокнах гаснуць агні і з'язджае апошні трамвай.**

Прадстаўляем пяць пляцовак, куды варта завітаць, каб далучыцца да трэнда і высокай культуры адначасова.

**1. Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» (пройдзе ўжо сёння, 14 мая)**
Містыка, тунэлі, легенды, палацавыя інтрыгі, ірландскія танцы. Ва ўнутраным дворыку пачнецца інтэрактыўны лабірынт. У ім — нечаканыя краявіды, недаступныя дагэтуль праходы і пакаленні славутых Радзівілаў, а ў канцы — палацавы баль. Усё, як таго патрабуе месца. Арганізатары робяць стаўку на аўру гістарычнасці. У гэтым антуражы адчуць, што ты на шляхецкай тусоўцы, будзе нескладана.

**2. Нацыянальны мастацкі музей у Мінску**
Стрыт-арт, гульні, медытацыі, партал паміж мінуўшчынай і будучыняй. Музей, які знаходзіцца ў працэсе пашырэння і аднаўлення, назваў сваю праграму «Учора+заўтра». Знак «+» — гэта сённяшні дзень: сам музей знаходзіцца на пэўным памежжы, прытым фантастычная тэма парталаў праз час і прастору прывабная сама па сабе. Тут можна будзе ўбачыць тэатральныя эксперыменты, паслухаць жывую музыку, паўдзельнічаць у гульнях, памедытаваць і, зразумела, яшчэ раз зірнуць на сцены музея з экспанатамі.

**3. Музей гісторыі беларускага кіно**
Мода, дэфіле, фота ў кінавобразе, эксклюзіўная кава. На афішы «Моднай ночы» Музея гісторыі беларускага кіно кадр з фільма «Снеданне ля Ціфані» з сімвалам кіно, стылю і сваёй эпохі Одры Хэпберн. Тэматыка «Ночы» з гэтым і звязана — са стылем. На пляцоўцы арганізуюць кінадэфіле, якое будуць суправаджаць каментары гісторыка моды Таццяны Церашковіч, а крыху пазней можна будзе паслухаць лекцыю яшчэ аднаго эксперта ў гэтай сферы — Сашы Варламава. Тут жа адбудзецца паказ калекцый адзення і аксесуараў. Жывая музыка, здымкі ў кіношных вобразах у спецыяльна арганізаваных фотазонах, лекцыі — усё на фоне выстаўкі адзення ручной работы, упрыгажэнняў і аксесуараў з Беларусі, Украіны, Літвы, Расіі і ЗША.

**4. Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў (дзве пляцоўкі — на праспекце Незалежнасці, 47 і на Някрасава, 3)**
Майстар-класы, спектакль, шоу светлавых карцін, DJ-сэты, Эндзі Уорхал. НЦСМ у праграме «Будзь геніем» прысвячае «Ноч музеяў» тым мастакам, якія сталі трывалай часткай масавай культуры, — папулярным класікам, чые карціны часцяком цытуюцца ў сучасным кантэксце. Марк Шагал, Рэнэ Магрыт, Эндзі Уорхал, Сальвадор Далі, Фрыда Кало. Апошняй прысвяціла сваю калекцыю, якая будзе паказана на Някрасава, дызайнер Natasha Tsu Ran. А ў будынку на праспекце пройдзе шоу светлавых карцін, якое распавядзе пра вядомую мастачку. На першай пляцоўцы пакажуць спектакль пра Эндзі Уорхала «Нічога асаблівага», а на столь будуць праецыравацца слайды і відэа з ажыўшымі карцінамі. На другой пройдуць майстар-класы па жывапісе і танцах, запрацуе творчая студыя па стварэнні скульптур, да якой можна будзе далучыцца.

**5. Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа**
Рок, квэст, рэтра-аўтамабілі, паэзія, беларускамоўныя настольныя гульні. Кажуць, дом Якуба Коласа быў заўсёды адкрыты для гасцей. Але пасля таго, як пачыналася ноч і ў акне творцы запальвалася святло, пісьменніка ніхто не турбаваў, бо гаражане ведалі: паэт заняты. Сваю праграму музейцы назвалі «Святло ў акне», а тэмай абазначылі падарожжы. Па папярэднім запісе можна паўдзельнічаць у квэсце, у якім адначасова са спаборніцтвам камандаў ўбачыць горад часоў класіка і месцы, апісаныя ў яго творах. У музеі пройдзе выстаўка рэтра-аўтамабіляў 1950-х гадоў, у гаражы пісьменніка будзе адкрыта экспазіцыя «У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа», адкрыюцца паэтычныя і музычныя пляцоўкі. Тут можна будзе паслухаць гурты Markuts Band, RECHA, Re1ikt і запісаць запаветнае жаданне чарнілamі, пяром і за сталом Якуба Коласа.

Традыцыйна да акцыі далучаюцца музеі па ўсёй краіне. Апроч сталіцы, выключныя праграмы ў "Ноч музеяў" правядуць у Полацку, Віцебску, Брэсце, Магілёве (дзе будуць арганізаваны нават дзве «ночы»), Гомелі, Браславе, Лідзе і іншых гарадах. Даты і час правядзення вар'іруюцца.

Бачылі ноч, гулялі ўсю ноч да раніцы.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

# НАСЕННЕ ПАДКАЖА...

## Што смажыць, квасіць і саліць

**У бліжэйшы час агароднікам не давядзецца сядзець склаўшы рукі. Самы час капаць і сеяць! Ад таго, як мы спрацуем сёння ў многім залежыць будучы ўраджай. Важна не пралічыцца з насеннем. Якія культуры выбраць для свайго агарода, мы пацікавіліся ў Інстытуце агародніцтва НАН Беларусі.**

### Гэта злосна бабуля называецца...

Агароднікам варта прыглядзецца да беларускага насення цыбулі, яно таннейшае за замежнае больш чым у дзесяць разоў. Імпартныя гібрыды каштуюць 300 еўра за кілаграм. Калі падлічыць, атрымаецца, што вытворца толькі на насенне «аддае» каля паловы ўраджаю. Да таго ж, айчынная цыбуля лепш захоўваецца ў хатніх умовах, чаго няма ў заходніх сартоў, якім для лёжкасці патрэбна нулявая тэмпература.

— Мы сталі ствараць сарты, якія адрозніваюцца лепшай лёжкасцю, што дасягаецца за кошт высокай колькасці сухіх рэчываў, — расказвае **загадчык лабараторыі паслёнавых культур Інстытута агародніцтва Леанід МІШЫН**. — Калі нашы лепшыя сарты назапашваюць да 18 працэнтаў сухога рэчыва, то лепшыя заходнія — 13. Беларуская цыбуля добрая для смажання, а замежная на патэльні будзе «высушвацца», бо ў ёй больш вады.

Дачнікам варта звярнуць увагу на шматгадовую цыбулю — культуры па біяхімічным саставе незаменныя для харчавання чалавека. Тым больш, што такую прадукцыю вы зможаце атрымліваць з ранняй вясны і без усялякай хімічнай абароны. Леташнія шніт-цыбулю, цыбулю-слізун, цыбулю-батун вы зможаце штогод наразаць на салаты ўжо на майскія святы.

Дзякуючы дзяржаўнай праграме, падтрыманай Прэзідэнтам, у нашай краіне была разгорнута вытворчасць айчынных сартоў часнаку. Быў час, калі на рынку амаль знікла такая прадукцыя. Але хутка людзі разгледзелі, што па смакавых якасцях беларускі часнок выйграе ў больш прыгожага белага кітайскага.

**За апошнія гады ў Інстытуце агародніцтва НАН Беларусі створаны вялікі спектр культур, прыстасаваных да ўмоў у нашай краіне (усяго 129 гатункаў і гібрыдаў па 39 культурах).**

### Сто адзежак і ўсе без засцежак

Доўгі час, краіна закупляла імпартнае насенне капусты. Нарэшце, беларускія вучоныя стварылі айчынныя гібрыды капусты. Шэраг іх быў выпрабаваны Дзяржкамісіяй на 6 сортаўчастках. Ураджайнасць дасягала тысячы цэнтнераў з гектара! Але для вытворчасці гаспадаркі, у тым ліку і фермерскія, працягваюць закупляць імпартныя гібрыды.

Сабекошт нашага насення складае 300-350 долараў за кілаграм насення. Лепшыя імпартныя гібрыды цягнуць на 2–3 тысячы долараў. Але, калі многія гаспадаркі не маюць палівальных сістэм, часам не хапае ўгнаенняў, своечасова не ўносяцца сродкі абароны і ў выніку атрымліваецца невялікая ўраджайнасць, ці ёсць сэнс пускаць валюту на дарагое імпартнае насенне. «Мы выходзілі з прапановай, каб тыя гаспадаркі і фермеры, якія не маюць ураджайнасці вышэй за 300-350 цэнтнераў з гектара, закуплялі айчынныя сарты, — расказвае Леанід Мішын. — Вытворцы б маглі эканоміць на насенні, а інстытуту гэта б дазволіла значна развярнуць насеннявodства». Між іншым, сёння, калі Інстытут агародніцтва праходзіць мадэрнізацыю, беларуская вучоныя змаглі нарэшце выводзіць гібрыды капусты на ўласнай тэрыторыі. Раней даводзілася лінію аддаваць у Італію і там размнажаць. Цяпер у новых цяпліцах ёсць ізаляваныя боксы — у адных расліны апыляюцца ўручную, у іншых — пры дапамозе чмялёў.

Ранні гібрыд капусты «Ілар'я», выведзены беларускімі вучонымі, па ўраджайнасці, ранняспеласці, якасці качаноў на дэманстрацыйных участках паказаў сябе нават лепш, чым замежныя гібрыды. Позні беларускія сарты «Аватар», «Белізар» могуць гэтак жа доўга захоўвацца, як і галандскія гібрыды. А вось аматарам квашанай капусты трэба звярнуць увагу на сярэдні і сярэдняпозні гатункі, напрыклад «Юбілейная», «Беларуская», «Надзея», «Русінаўка». Яны ўтрымліваюць больш соку, менш накопліваюць гаркаты, якая можа быць у капусце.

Дарэчы, квашаныя прадукты змяшчаюць жывыя малочна-кіслыя бактэрыі, якія забіваюць гніласныя інфекцыі, плюс з імі ў арганізм паступаюць вітаміны групы В.

### Сядзіць паня ў каморы, яе косы на дворы

Беларускія гатункі морквы, можа, і не такой інтэнсіўнай афарбоўкі, як тыя, што завозяцца, але яны адрозніваюцца добрай лёжкасцю. Без рыхлай глебы, угнаенняў, абароны ад насякомых вы не атрымаеце якаснай морквы ні з якога насення. Калі не апрацуеце яе ад насякомых, яны пашкодзяць караняплод і ён захоўвацца не будзе.

**Аматарам квашанай капусты трэба звярнуць увагу на сярэднія і сярэдняпознія гатункі. Яны ўтрымліваюць больш соку, менш накопліваюць гаркаты, якая можа быць у капусце.**

Не варта набываць «з рук» насенне радыскі, калі не хочаце застацца без ураджаю. Некаторыя замежныя фірмы могуць вырошчваць насенне радыскі на поўдні Украіны, Расіі, Польшчы і не выбракоўваць расліны, якія хутка выпускаюць «стрэлкі». Калі за гэтым не сачыць, сорт выраджаецца і нават пры добрай агратэхніцы з яго складана будзе нешта вырасціць, бо радыска хутка зацвіце. Па тэхналогіі павінны адбірацца тыя караняплоды, якія найменш схільныя да цвіцення. Яны ўручную перасаджваюцца, і ўжо з іх вырошчваецца насенне. Калі набудзеце беларускае насенне, радыска не зацвіце.



### Ляжыць сярод градкі зялёны і гладкі

Адрозная асаблівасць беларускіх сартоў агуркоў — прыдатнасць да засолу (а не толькі марынавання!).

— Я рэкамендаваў бы дачнікам заўсёды мець у цяпліцы 1-2 расліны партэнакарпічных агуркоў (якія не патрабуюць апылення пчоламі). Яны забяспечаць сям'ю на ўсё лета салодкімі смачнымі агуркамі без усялякай хімічнай абароны, праўда, не падыходзяць для перапрацоўкі, — заўважае Леанід Мішын. — А вось з, як людзі кажуць, «пухірыстымі» агуркамі, што самымі першымі з'яўляюцца на рынку трэба быць асцярожнымі. Неяк у інстытут тэлефануе фермер з Брэста, скардзіцца, што краі лістоў на агурках пачарнелі, і пералічвае прэпараты, якімі ўжо «безвынікова» апрацавалі расліны. Прычым усе гэтыя сродкі ад насякомых, а не ад гэтай хваробы. Гэта ж што за прадукцыю пасля атрымаюць спажыўцы? Таму раю лепш набываць цяплічныя агуркі, чым неправераную агародніну. Тым больш што сёння гаспадаркі могуць падбіраць расліны, устойлівыя да перанаспарозу, а значыць, іх не давядзецца труціць хіміяй.

**Беларуская цыбуля добрая для смажання, а замежная на патэльні будзе «высушвацца», бо ў ёй больш вады.**

Агароднікам вучоны раіць звярнуць увагу на беларускія сарты гарбузоў «Залатая карона», «Чырвоны», «Дэльта». Яны змяшчаюць вялікую колькасць караціну, цукру, на іх практычна не бывае алергіі. З іх можна гатаваць кашы, нарэзанымі на кубікі запякаць у духоўцы.

***З інфармацыяй па беларускім насенні можна азнаёміцца на сайце Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.***

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

### АМАТАРАМ ЭКЗОТЫКІ...



...можна паспрабаваць завесці ў сябе фізаліс сунічны, ён вырошчваецца з расады, як тамат у адкрытым грунце, не патрабуе ніякай хімічнай абароны. Плады памерам з буйную вішню, бурштынавага колеру, прыемнага кісла-салодкага смаку. Выспявае да 10 жніўня. У Брэсце агароднікі нават праводзілі шэраг кулінарных эксперыментаў: дабаўлялі фізалісы ў кетчупы і аджыкі, што паляпшала іх смак. Агародны фізаліс добры ў марынаванні па рэцэпце зялёных памідораў з часнаком. Дарэчы, у выніку даследаванняў японскія, французскія вучоныя ўстанавілі, што ў зялёных памідорах маюцца рэчывы, якія падтрымліваюць імунную сістэму. І ўжо ў свеце выпрацоўваюцца лекавыя прэпараты на аснове зялёных памідораў. «На вёсках у Беларусі здаўна з задавальненнем салілі зялёныя памідоры, і сёння да нас у жніўні звяртаюцца аматары такіх нарыхтовак, — расказвае Леанід Мішын. — А калі пры марынаванні дабавіце некалькі штук гваздзікі, атрымаеце той самы любімы смак, які быў у таматаў, што рабіліся на заводах у савецкі час.

# ЦВІЛЬ І ДРОЖДЖЫ — ЯКІЯ «СЮРПРЫЗЫ» ХАВАЮЦЦА Ў ПРАДУКТАХ?

**Гомельскай абласной інспекцыяй Дзяржстандарту пры праверцы гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Прыпяцкі Альянс» у супермаркеце «Родны кут» (Мазыр) было выяўлена, што тварожны прадукт з заменнікам малочнага тлушчу, які рэалізуецца ў ім, не адпавядае патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы малака і малочнай прадукцыі» (ТР МС 033/2013) па мікрабіялагічным паказчыку. У ходзе выпрабаванняў у адабраных узорах гэтага прадукта было выяўлена перавышэнне дапушчальнай колькасці дражджэй у 16 разоў! Выраблена гэтая прадукцыя ТАА ВК «Айсберг-Люкс» (Расійская Федэрацыя). Прадпрыемству «Прыпяцкі Альянс» выдадзена прадпісанне аб ліквідацыі парушэнняў, складзены пратаколы аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці.**

Акрамя таго, гэтай гандлёвай арганізацыі, а таксама імпарцёру ў Рэспубліку Беларусь — сталічнаму ТДА «Сялянскі падворак» — выдадзены прадпісанні на забарону ўвозу і абарачэнне гэтай прадукцыі ў нашай краіне. Дзеянне дэкларацыі аб адпаведнасці патрабаванням ТР на яе на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь спынена.

Забаронныя захады былі ўжыты і да ТАА «Ірмол» (Мінская вобласць). Інспекцыяй Дзяржстандарту па Мінскай вобласці і Мінску ў ходзе праверкі гэтай арганізацыі і праведзеных выпрабаванняў была ўстаноўлена неадпаведнасць сыру плаўленага «Сырны торт» з грэцкімі арэхамі патрабаванням ТР МС «Аб бяспецы малака і малочнай прадукцыі» па паказчыках бяспекі. Ва ўзоры выяўлена перавышэнне дапушчальнай колькасці цвілі ў 9 разоў!

Вытворцам прадукцыі з'яўляецца MADETA a. s» (Чэшская Рэспубліка).

Забарону на ўвоз і продаж у рэспубліцы таксама атрымала гарбата «Фруктовы настой BIFIX «Чарніца» польскай вытворчасці. У выніку праверкі ТАА «Натуральная лінія» (Мінск), якое з'яўляецца імпарцёрам, была ўстаноўлена неадпаведнасць названай прадукцыі патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы харчовай прадукцыі» (ТР МС 021/2011) па мікрабіялагічным паказчыку. Перавышана дапушчальная колькасць дражджэй у прадукце ў 12 разоў, цвілі — 7 разоў.

— Такія парушэнні могуць быць звязаныя з тым, што прадукт прайшоў недастатковую тэрмічную апрацоўку, не выкананы тэхналогіі падрыхтоўкі, а таксама недастаткова апрацавана тэхналагічная лінія на вытворчасці, — адзначылі спецыялісты інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і Мінску.

Усяго па выніках праверак за I квартал 2016 года Дзяржстандартам выдадзены прадпісанні аб забароне ўвозу ў Рэспубліку Беларусь 125 найменняў небяспечнай прадукцыі, з іх 12 найменняў — харчовай. Спынена дзеянне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза на 85 найменняў спажывецкіх тавараў, з іх 6 найменняў — па харчовай прадукцыі.

Адпаведныя рэестры размешчаны і абнаўляюцца на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by).

**Дар'я ШОЦІК.**

■ По той бок прылаўка

# ПЫТАННІ ДА ЯКАСЦІ І МАРКІРОЎКІ ІМПАРТУ ЗАСТАЮЦЦА

**У першым квартале года Міністэрства гандлю па фактах парушэнняў юрыдычнымі асобамі тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза ў сферы абароны правоў спажыўцоў (рэалізацыя тавараў без сертыфікатаў (дэкларацый) адпаведнасці і маркіроўкі, прадугледжанай тэхрэгламентам) накіравала ў судовыя органы больш за 60 пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях.**

Асаблівая ўвага пры праверках надаецца таварам, ад якасці і бяспекі якіх наўпрост залежыць здароўе і жыццё спажыўца: таварам для дзяцей, парфумерна-касметычнай прадукцыі, прадуктаў харчавання і іншаму, паведамілі ў прэс-службе міністэрства.

Напрыклад, у Салігорску ў сувязі з адсутнасцю дакументаў і маркіроўкі была спынена рэалізацыя 12 найменняў дзіцячых цацак кітайскай вытворчасці, а таксама 7 відаў кандытарскіх вырабаў, выраблених у Расійскай Федэрацыі; у Мінску — 13 разнавіднасцяў расійскай пасцельнай бялізны, падушак і коўдраў, у Мар'інай Горцы — 21 найменне туалетнай вады, тушы, пудры, лакаў для пазногцяў і г.д. імпартнай вытворчасці (Іспанія, Францыя, Швейцарыя, Ірландыя і Украіна).

Па 9-ці ўжо разгледжаных адміністрацыйных справах вінаватыя асобы прыцягнуты судамі да адказнасці ў выглядзе штрафаў на суму звыш 150 мільёнаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены**

# ПО ПРОДАЖЕ ТЕПЛИЧНОГО КОМПЛЕКСА

**с инв. № 250/С-37773 и оборудования, расположенного по адресу:**
**Витебская обл., Полоцкий р-н, Боровухский с/с, д. Гвоздово, ул. Земляничная, 12,**
**принадлежащих ОАО «Нафтан»**

Земельный участок площадью 11,2957 га с кадастровым номером 223881401601000039. Целевое назначение – использование под тепличное хозяйство. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: - в охранных зонах линий электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадь 0,8073 га; - в водоохранных зонах водных объектов (река Полюшка), площадь 0,7050 га; - в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,3690 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 83 725 295 894 бел. руб.**
**Задаток – 2 000 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже тепличного комплекса и оборудования ОАО «Нафтан»,* **проводимом 25 мая 2016 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть подписан в течение 30 (тридцати) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу всю стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 250 000 000 (Двести пятьдесят миллионов) белорусских рублей в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **25.05.2016 в 09.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 23.05.2016 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.11.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**сообщает о проведении 15 июня 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Силичи, ул. Курортная, д. 6 623284605401000310 | 0,1090 | водоснабжение, газоснабжение | 29 342 100 | 14 576 100 + реклама | 2 934 300 |
| 2 | д. Знаменка, ул. Центральная, д. 1А 623284603001000195 | 0,1213 | водоснабжение, газоснабжение, электроснабжение | 27 431 100 | 15 604 000 + реклама | 2 743 200 |
| 3 | д. Знаменка, ул. Центральная, д. 1 623284603001000194 | 0,1134 | водоснабжение, газоснабжение, электроснабжение | 25 644 600 | 16 193 200 + реклама | 2 564 500 |

Земельный участок в д. Силичи, ул. Курортная, д. 6 имеет ограничения в использовании площадью 0,1090 га в связи с расположением в водоохранной зоне пруда.

Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 15 июня 2016 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений – **9 июня 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: (801774) 55056, 28473.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 14 июня 2016 года в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**

## Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

**находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, д. 11, корп.1, каб. 221.**

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**1.** Помещение №20, арендуемой площадью 34,4 кв.м, на первом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 169 600 рублей; размер задатка – 116 960 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

**2.** Помещение №206, арендуемой площадью 30,6 кв.м, на втором этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 040 400 рублей; размер задатка – 104 040 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

**3.** Помещение №526, арендуемой площадью 35,4 кв.м, на пятом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 203 600 рублей; размер задатка – 120 360 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 400 рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 14 мая 2016 года по 13 июня 2016 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 13 июня 2016 года, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

*- **физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

*- **индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

*- **юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 15 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефоны для справок: (8-017) 209-90-93, (8-017) 209-92-78.

# РУП «Институт недвижимости и оценки»

## извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Апартамент № 001 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь –101,2 кв.м | 13 258 008 | 1 325 800,80 |
| Лот № 2 | Апартамент № 002 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 59,7 кв.м | 7 814 196 | 781 419,60 |
| Лот № 3 | Апартамент № 003 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 61,2 кв.м | 8 009 604 | 800 960,40 |
| Лот № 4 | Апартамент № 101 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -1. Площадь – 101,7 кв.м | 13 924 944 | 1 392 494,40 |
| Лот № 5 | Апартамент № 104 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -1. Площадь – 100,8 кв.м | 13 604 220 | 1 360 422 |
| Лот № 6 | Апартамент № 202 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2-ой. Площадь – 170,9 кв.м | 22 932 828 | 2 293 282,80 |
| Лот № 7 | Апартамент № 210 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2-ой. Площадь – 97,7 кв.м | 14 269 032 | 1 426 903,20 |
| Лот № 8 | Апартамент № 211 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2-ой. Площадь – 123,3 кв.м | 18 007 272 | 1 800 727,20 |
| Лот № 9 | Апартамент № 305 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв.м | 16 441 884 | 1 644 188,40 |
| Лот № 10 | Апартамент № 306 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв.м | 13 905 828 | 1 390 582,80 |
| Лот № 11 | Апартамент № 308 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв.м | 24 587 424 | 2 458 742,40 |
| Лот № 12 | Апартамент № 309 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв.м | 9 024 876 | 902 487,60 |
| Лот № 13 | Апартамент № 404 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв.м | 10 335 384 | 1 033 538,40 |
